КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №8 (184)
◂ 5 САКАВІКА ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**АНТОН АСТАПОВІЧ**

Стар. 4

**КАЛІ НЕ Я, ТО ХТО?**

2 сакавіка адзначаліся ўгодкі аднаго з буйнейшых пагромаў Мінскага гета. Цяпер ушанаванне памяці загінулых праводзіцца ў адкрытую

Стар. 6

**РЭАБІЛІТАВАЦЬ ДЫКТАТАРА**

Дачка дыктатара Трухільё паспрабавала апраўдаць бацьку. І вось што з гэтага атрымалася. Рэпартаж са сталіцы Дамініканскай рэспублікі, Санта-Дамінга, журналіста «НЧ» Алега Новікава

Стар. 12

**УЛАДЗІМІР БАЙДАЎ: У ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ ЎСЁ ЗВЯЗАНА**

Стар. 15–16

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ДАЧКА ВІТАЎТА**

Нарыс Кастуся Тарасава з цыклу «Невядомая гісторыя»

▸ **З НАГОДЫ**

# ШТРАФЫ РАСТУЦЬ ПА ВЯСНЕ

**Вольга ХВОІН**

**Была б спіна — знойдзецца віна, сцвярджае беларуская прымаўка. Нормы новай рэдакцыі Адміністратыўнага кодэкса, што ўвайшоў у сілу з 23 лютага, ужо знайшлі сваё прымяненне ў сітуацыях, якія да гэтага не выклікалі сумненняў у іх законнасці.**




Веласіпедыстам, што сядаюць на свайго двухколавага сябра пасля прыняцця на душу, таксама варта быць гатовымі раскашэліцца для дзяржаўнай казны. Беларуская вёска ў гэтым плане — залатое дно

Напрыклад, у Гомелі дэгустацыю алкагольнай прадукцыі адной з кампаній міліцыя палічыла распіццём у грамадскім месцы. На арганізатараў прома-акцыі склалі пратакол. Гэта даволі абсурднае рашэнне органаў аховы парадку не абышлося без удзелу прадстаўнікоў часам занадта актыўнага аргкамітэта па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя». Гомельскі каардынатар аргкамітэта Яўген Якавенка звярнуў увагу на тое, што ў наведвальнікаў крамы, якія падыходзілі да прома-стэнда, не правяралі пашпартоў, маўляў, сярод іх маглі быць і няпоўнагадовыя. Выклікалі міліцыю. У выніку быў складзены пратакол за распіццё спіртных напояў у грамадскім месцы і агітацыю за іх ужыванне. Цяпер аматарам дэгустацый на халяву трэба быць двойчы пільнымі: перш чым падняць кілішак крамбамбулькі — азірніцеся па баках.

Барацьба з п'янствам праз вялізныя штрафы — бадай найбольш кідкае новаўвядзенне. За ўжыванне алкаголю, у тым ліку і піва, у грамадскіх месцах і ў транспарце — штраф за першае парушэнне да 280 тысяч рублёў, а за другое — да 580 тысяч рублёў. У сеціве, якое цяпер з'яўляецца месцам акумуляцыі эмоцый беларусаў, абмяркоўвалася не толькі тэма высокіх штрафаў, але і спосабы абысці закон. Аднак трэба прызнаць, што метад хавання адкаркаванай бутэлькі ў непразрысты пакет у нашай краіне наўрад ці пракаціць. І піць цяпер будуць у залежнасці ад напоўненасці гаманца: у барах-рэстаранах, дома ці ў пад'ездах.

Два апошніх варыянты, відаць, будуць найбольш запатрабаванымі: піцейных устаноў, якія працуюць у сегменце невысокіх цэн, бракуе, а ў наяўныя нятанныя бары і кавярні вечарам выходнага дня і да падвышэння штрафаў было не прабіцца. Кажуць, што ідэю ўзмацніць пакаранне за распіццё алкагольных напояў у грамадскіх месцах падтрымлівала Міністэрства аховы здароўя. Маўляў, нацыя катастрафічна хутка співаецца, адзін жыхар Беларусі штогод спажывае каля 12 літраў умоўнага спірту, калі Сусветная арганізацыя здароўя лічыць, што пры перавышэнні паказчыка 8 літраў на год у арганізме чалавека адбываюцца незваротныя працэсы. Толькі забарона, паводле сваёй эфектыўнасці, — метад слабы. Калісьці пасля ўвядзення «сухога закону» людзі пачалі актыўна прыгадваць бабчыны рэцэпты самагону ды майстраваць апараты для вытворчасці гэтага прадукту. Цяпер хіба што разбрыдуцца з паркаў у падваротні.

Вартыя ўвагі і папраўкі ў Адміністратыўны кодэкс для ўсіх удзельнікаў дарожнага руху. Веласіпедыстам, што сядаюць на свайго двухколавага сябра пасля прыняцця на душу, таксама варта быць гатовымі раскашэліцца для дзяржаўнай казны. Парушыў Правілы дарожнага руху ў стане алкагольнага ці наркатычнага ап'янення — рыхтуй штраф на 3–5 базавых велічынь (ад 105 да 175 тысяч рублёў). Як падумаць, то добры закон для латання дзірак у бюджэце: беларуская вёска ў гэтым плане — залатое дно. І веласіпедыстаў, і п'яных, а таксама варыянтаў «два ў адным» там хапае. Дарэчы, аналагічны штраф веласіпедыст можа атрымаць, калі адмовіцца праходзіць медагляд. А калі ў нецвярозым стане справакуе аварыйную сітуацыю, то штраф будзе 280 тысяч рублёў (восем базавых велічынь).

Аматарам экалагічнага транспарту, а такіх у гарадах з кожным годам усё больш, да чарговага веласезону варта ці падрыхтаваць гаманец да штрафаў, ці даўкамплектаваць свой ровар. За катанне на веласіпедзе ў цёмны час сутак без ліхтарыка трэба будзе заплаціць штраф да 3 базавых велічынь (105 тысяч рублёў). Раней пакаранне было менш суровым і за гэту правіннасць маглі выпісаць штраф толькі на 17,5 тысяч рублёў, ці 0,5 базавай велічыні.

А вось аўтамабілістаў не будуць прыцягваць да адміністратыўнай адказнасці, калі пацярпелы бок не напіша пра гэта заяву. Даішнікі ў такім разе толькі папярэдзяць вінаватага ці, у крайнім выпадку, выпішуць штраф за парушэнне правілаў дарожнага руху. Да прыкладу, ігнараванне чырвонага сігналу светлафора абыдзецца максімальна ў 175 тысяч рублёў. Алкагольны складнік дарожнага руху сямейны бюджэт аблегчыць няслаба: за паўторнае кіраванне ў нецвярозым стане можна атрымаць штраф да 35 мільёнаў рублёў.

Пешаходам, якія дагэтуль толькі пасмейваліся з флікераў як аб'екту сучаснага фальклору, варта падумаць пра набыццё гэтых «аксесуараў». Штраф у 105 тысяч рублёў — не жартачкі.

І на закуску новаўвядзенні для беларусаў з камерцыйнай жылкай. За нелегальны дробны бізнес, як то гандаль у пераходах семкамі, «таксаванне» ды здача ў арэнду кватэр, чакае штраф у памеры да 3,5 мільёна рублёў. І гэта не самае горшае. У законе прапісана, што магчымая і канфіскацыя «рэчаў, прадметаў і сродкаў здзяйснення правапарушэння». У гандляркі забяруць семкі, у нелегальнага таксоўшчыка — машыну, у арэндадаўцы — кватэру. Каб не нарывацца на непрыемнасці, прадстаўнікі міліцыі раяць весці свой бізнес афіцыйна ды сплочваць усе падаткі.

Калі вы не ведаеце, што падарыць сваім блізкім на вясновыя святы, то набудзьце новы Адміністратыўны кодэкс. Можа, гэта і не рамантычна, затое веданне закону дазволіць зберагчы ўласны бюджэт. Тым больш што дзяржава яўна не супраць пажывіцца з вашай кішэні.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### МЯДЗЕЛ. ВЫСТАВА ЗА ВЫСТАВАЙ



Фота ocheretniya

У музеі Народнай славы Мядзела адкрылася выстава «Беларуская вопратка: ад мінулага да сучаснага». На ёй дэманструюцца мужчынскія і жаночыя шляхецкія касцюмы, народныя строі і сучаснае адзенне з ільну. Наведвальнікі маюць магчымасць сфатаграфавацца ў народным ці шляхецкім убранні. А на выставе «Музыка гістарычных сядзіб», што месціцца побач, можна паслухаць творы беларускіх кампазітараў XIX стагоддзя, даведацца шмат цікавага пра іх аўтараў.

### ВІЛЕЙКА. ТРАФЕІ НА ВЫСТАВУ

1 сакавіка ў мясцовым краязнаўчым музеі арганізавана новая выстава «Трафеі Перамогі». Супрацоўнікі гэтай установы звярнуліся да грамадзян, каб усе жадаючыя паўдзельнічаць у мерапрыемстве прынеслі прадметы часоў другой сусветнай вайны. У музеі ўжо ёсць частка экспанатаў з Нямеччыны — посуд, гадзіннік, акардэон. Пасля заканчэння выставы, якую ўрачыста адчыняць 9 мая, рэчы будуць вернуты гаспадарам.

### ГЛЫБОКАЕ. З ГІСТОРЫІ ДАЖЫНАК

Дажынкі на Беларусі маюць векавую традыцыю. А вось як яны падаюцца ўладамі — справа іншая. Блогерка ocheretniya выклала ў сеціве галерэю старых здымкаў з Дажынак, якія праходзілі ў Глыбокім у 1934 годзе. Гэтыя матэрыялы ўзятыя з польскага Народнага лічбавага архіву, дзе можна знайсці і іншыя цікавыя архіўныя звесткі па гэтаму краю. У беларускім ЖЖ глыбоцкія даваенныя Дажынкі выклікалі надзіва гарачыя дыскусіі. Блогер kryviec піша: «Неверагодна прыгожыя здымкі! Абавязкова глядзець тым, хто верыць бальшавіцкім байкам пра «польскі прыгнёт», асабліва на фоне таго, як у БССР усё народнае пачало вынішчацца, як «перажыткі» аджылага ладу, а Купала брыдка апяваў урбаністычны наступ на традыцыі. Таксама параўнайце, у што гэта ператварылася сёння».

### ПАСТАВЫ. ДАПАМОЖНІК ШКОЛЬНІКАМ

У мінскім выдавецтве «Кнігазбор» выйшла кніга краязнаўцы Ігара Пракаповіча «Чароўны край — Пастаўшчына». Паводле анатацыі, кніга «адрасуецца вучням, настаўнікам, студэнтам, краязнаўцам, турыстам, і ўсім, хто цікавіцца родным краем», аднак падзел тэксту на параграфы паказвае, што выданне ў першую чаргу разлічвалася для школьнікаў, якія будуць займацца на факультатыўным курсе «Паставазнаўства». Тэкст выдання прыцягвае да сябе ўвагу сваёй якасцю і грунтоўнасцю. Добры і ілюстратыўны матэрыял — некалькі сотняў фотаздымкаў, картаў, малюнкаў, копіяў дакументаў ствараюць выдатнае графічнае суправаджэнне тэксту. Пытанні, якія аўтар змясціў пасля кожнага параграфа, мусяць спрыяць засваенню і асэнсаванню ведаў па гісторыі роднага краю. Апісанне гісторыі Пастаўскага раёна выдатна ўпісана ў агульны кантэкст гісторыі Беларусі. Такім чынам, чытачы змогуць паглядзець на гісторыю краіны праз прызму гісторыі сваіх родных мясцінаў, што, безумоўна, паспрыяе засваенню вучнямі ведаў па гісторыі Беларусі.

### ПОЛАЦК. ЗАВІТАЎ БАРД



На гэтым тыдні на Полаччыну завітаў вядомы беларускі музыка Зміцер Вайцюшкевіч. На працягу дня ён правёў некалькі сустрэч са студэнтамі і школьнікамі Полацка і Наваполацка. А ў бібліятэцы імя Якуба Коласа ў Наваполацку адбылася вялікая творчая вечарына з вядомым выканаўцам. Імпрэзы арганізаваныя суполкай «Рубон» Наваполацкай гарадской арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны з дапамогай грамадзянскай ініцыятывы «Будзьма беларусамі».

### ШАРКАЎШЧЫНА. ІНТЭРНЭТ ПЕНСІЯНЕРАМ

Лідэр «Дыскусійнага клуба 24» Уладзімір Рамановіч плануе арганізаваць шэраг сустрэч па тэме «Роля кампутара і інтэрнэта для наладжвання камунікацыі паміж людзьмі сталага ўзросту». Сваю думку Уладзімір Рамановіч абгрунтоўвае так: «Гэта мяне зацікавіла яшчэ некалькі месяцаў таму. Калі маці сказала, што даўно не была ў сваіх родных у Вільні, бо трэба віза дый праезд для яе не танны. А такіх людзей шмат. Зразумела, што ў асноўным актыўнымі карыстальнікамі сеціва з'яўляюцца асобы да 40 гадоў. А людзі больш сталага ўзросту лічаць, што ім гэта не патрэбна, бо не бачаць сэнсу. Вось я вырашыў з дапамогай удзельнікаў клуба і запрошаных гасцей больш дэталёва высветліць перспектывы і рэалізацыю ідэі». Напрыканцы лютага першы семінар-дыскусія па гэтай тэме прайшоў у пасёлку Германавічы ў прыватным мастацка-літаратурным музеі імя мастака Міхася Райчонка. Сярод прысутных былі мясцовая актывістка і куратар праекта Ада Райчонак, музыка, паэт і бард Андрэй Хадановіч.

---

ВІНШАВАННЕ

## БЛАСЛАВІЦЕ ЖАНЧЫНУ!

**У рэдакцыю прыйшоў ліст ад нашага чытача. Узнёслае, шчырае слова ў гонар Жанчыны. Пранікнёнае, добрае слова — віншаванне са святам. Разам з ім, з усімі нашымі чытачамі віншуем вас, дарагія жанчыны, з вясновым святам. І зычым кожнай хоць кропельку свята не раз на год, а кожны дзень!**



Жанчына! Мама, мамачка, матуля! Колькі таемнага абаяння ў гэтых словах! Як не любіць, як не ўкленчваць перад табой, мама?! А з чаго пачынаецца? Дзяўчынка, дзяўчо, дзяўчына. Імгненне, — ужо нявеста, нявестачка, жонка. А вось і дочачка, доча, дачушка.

Жанчына… Ці ёсць словы больш урачыстыя, святочныя, важкія? Кожнаму ты падарыла жыццё, — у слязах, родавым цярпенні, з думкай: «Ідзі, дзіця маё, насустрач сонцу, радуй усіх і ніколі-ніколі не забывай маці, бацькоў сваіх». Ці ёсць у свеце дзіва больш фантастычнае, чым ты, жанчына! Дзякуй Усявышняму за гэты чароўны твор — жанчыну — нябесна-зямны падарунак зямлянам.

Жанчына! Хваляванне перахоплівае дух. Меў рацыю вялікі М. Мантэйнь: «Непрыгожых жанчын няма, ёсць жанчыны, якія не ведаюць, што яны прыгожыя». Прыгажосць — чароўнасць жанчын роднай Беларусі. Не толькі фізічная, але і духоўная. Насамрэч гэта прыгажосць слоў, думак, учынкаў.

Жанчына! Навучы, школа, кожнага ў кожнай бачыць Яе Вялікасць Жанчыну, — сваю матулю, сваю дачушку, сястру, унучку, бабулю. І тады нашы беды — не беды. І тады нават будучы Калігула не асмеліцца адабраць ільготы ў старэнькіх. І ў такім разе, дасць Бог, збудзецца прароцтва геніяльнага Дастаеўскага: прыгажосць выратуе свет.

Шаноўныя жанчыны! Ёсць пажаданне, каб зрабілася Ваша жыццё больш змястоўным і прыгожым.

Са святам Вас, шаноўныя Жанчыны. Са святам Вас, мае дарагія дочкі і ўнучкі.

Блаславіце Жанчыну!

**Мікола Турчанка,**
**кандыдат тэхнічных навук,**
**прафесар, ветэран працы**

---

СМІ

## АДНАВІЦЬ ЗАКОННАСЦЬ

**ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» 2 сакавіка накіравала генеральнаму пракурору Рэспублікі Беларусь Рыгору Васілевічу адкрыты ліст.**

«На працягу апошніх дзесяці дзён супрацоўнікі міліцыі нібыта на падставе расследавання крымінальнай справы аб паклёпе правялі ператрусы ў журналістаў, сябраў ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў», — гаворыцца ў лісце. — 17 лютага супрацоўнікі міліцыі на чале з маёрам Ленінскага РУУС г. Мінска Аляксандрам Чуем абшукалі працоўнае месца намесніцы рэдактара газеты «Народная воля» Марыны Коктыш і забралі сістэмны блок яе кампутара. 26 лютага некалькі супрацоўнікаў Савецкага РУУС г. Мінска на чале са следчым Камінскім правялі ператрус у кватэры шэф-рэдактара гэтага ж выдання Святланы Калінкінай. У той жа дзень супрацоўнікі міліцыі спрабавалі трапіць з мэтай правядзення ператрусу ў кватэру журналісткі Ірыны Халіп».

Гэтыя ператрусы нагадалі падзеі двухгадовай даўніны, калі таксама з нагоды расследавання крымінальнай справы аб паклёпе і знявазе, але прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, падобнае адбылася ў кватэрах журналістаў па ўсёй Беларусі.

«Як і зараз, тады ў пастановах на ператрус не прыводзілася ніякіх канкрэтных падставаў, акрамя спасылкі на тое, што ў месцах ператрусаў нібыта «могуць знаходзіцца прадметы, якія могуць мець значэнне для справы». Як і зараз, асобы, у якіх праводзіліся ператрусы, не з'яўляліся падазраванымі альбо абвінавачванымі па справе. Як і зараз, у грамадскасці былі ўсе падставы меркаваць, што сапраўднай мэтай ператрусаў з'яўляецца перашкода журналісцкай дзейнасці і запалохванне журналістаў», — адзначаецца ў лісце.

БАЖ заклікае неадкладна вярнуць адабраную маёмасць, а таксама настойвае на прыняцці мер пракурорскага рэагавання для аднаўлення законнасці, абароны парушаных правоў і законных інтарэсаў журналістаў, а значыць — і свабоды слова ў Рэспубліцы Беларусь.

**Паводле інфармацыі ГА БАЖ**

---

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

## «БЕЛОРУСЫ: ОТ «ТУТЭЙШЫХ» К НАЦИИ»

**Аляксей ХАДЫКА**

**Выдавецтва «ФУАінфарм» у серыі «Неизвестная история», пачатак якой паклала рэзанансная кніга Анатоля Тараса «Войны Московской Руси с Великим княжеством Литовским и Речью Посполитой в XIV–XVII веках», прапанавала чытачу новае выданне. Гэтым разам ім стала даследаванне Юліі Чарняўскай — «Белорусы: от «тутэйшых» к нации».**

Аўтар кнігі, культуролаг, антраполаг і пісьменнік, падыходзіць да вырашэння сваёй задачы, выкарыстоўваючы сучасную сусветную метадалогію, заснаваную на аналізе «культуры паўсядзённасці». Фактычна разглядаецца «аўтапартрэт нацыі», адлюстраваны для розных эпох у спецыфічных корпусах крыніц: традыцыйных казках, ліставанні, дакументах — для савецкага часу, а таксама матэрыялах блогасферы для пабудовы вобразу постсавецкага беларуса.

Аўтарка сцвярджае, што ўпершыню ў гісторыі краіны яе асаблівае становішча «паміж Усходам і Захадам», якое цікава аналізаваў яшчэ Ігнат Абдзіраловіч, робіцца станоўчым фактарам.

На думку Чарняўскай, дзейнічае правіла абароны сваіх малых сацыяльных груп — «рабі, як людзі робяць». Таксама як і механізм аб'яднання нацыі з мноства этнічных і рэгіянальных супольнасцяў, якіх сёння ў Беларусі налічваецца 144. І палякі, і рускія, і іншыя народы ў Беларусі істотна адрозніваюцца ад сваіх суродзічаў у метраполіях, і невыпадкова, што прадстаўнікі іншых нацый гістарычна зрабілі значны ўклад у развіццё беларускай культуры. Адзінае, што неабходна ўмацоўваць, — рэальнае раўнапраўе беларускай мовы, праз яе функцыянаванне ў культуры паўсядзённасці, у масавай літаратуры, у перакладах сусветнай класікі. І таму прагноз аўтаркі аптымістычны: «Апошні народ, які загіне на Зямлі, — будуць беларусы».

Сёння ў разуменні ананімных блогераў абмяркоўваюцца і фармулююцца некалькі этнанацыянальных дыскурсаў, але ўсе яны з'яўляюцца фактарамі аб'яднання нацыі. Версіі этнічнасці — «ліцвінская» (арыстакратычная), «крывіцкая» (археалагічная), народна-дэмакратычная, нацыеграмадзянская, у меншай ступені савецкая і іншыя, ідучы ў масы, спрыяюць выпрацоўцы агульнабеларускіх нацыянальных сімвалаў і брэндаў, якіх раней не хапала Беларусі, падобных «галандскім цюльпанам» ці «аргенцінскаму танга». Фармулюецца тое, што часам ігнаруецца палітычнымі дзеячамі ці афіцыйнай ідэалогіяй. Тэарэтычныя канструкты ідуць у практыку паўсядзённасці.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# УСІМ СЁСТРАМ — ЗАВУШНІЦЫ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Больш за два тыдні беларускія заўзятары не спалі па начах. Усе сачылі за Алімпіядай у Ванкуверы. Усе перажывалі за сваіх улюбёных спартоўцаў. Уначы 28 лютага Алімпіяда завяршылася.**




На XXI зімовых Алімпійскіх гульнях, дзе выступіла больш за 2600 спартсменаў, было разыграна 86 камплектаў узнагарод, якія дасталіся прадстаўнікам 26 з 82 краін, якія ўдзельнічалі. У неафіцыйным медальным заліку першае месца занялі гаспадары — 14 залатых, 7 сярэбраных і 5 бронзавых узнагарод. Па колькасці медалёў першынствавалі ЗША — 37 (9, 15, 13). Канада ўстанавіла новы рэкорд па колькасці залатых медалёў, заваяваных адной краінай на адной зімовай Алімпіядзе, ЗША — па агульнай колькасці узнагарод.

Беларусь з трыма медалямі (1, 1, 1) заняла 17-е месца па якасці медалёў (разам са Славакіяй) і 18-е па колькасці (з Аўстраліяй, Славакіяй, Славеніяй і Харватыяй). Прадстаўнік нашай краіны ўпершыню заваяваў залаты медаль зімовай Алімпіяды (Аляксей Грышын, фрыстайл). Таксама ўпершыню Беларусь заваявала больш за дзве ўзнагароды на адных зімовых Алімпійскіх гульнях.

Але не колькасцю ўзнагарод запомніцца беларускім заўзятарам гэта Алімпіяда. Хутчэй за ўсё, яна запомніцца не вельмі адэкватнымі паводзінамі трэнера беларускай зборнай па хакеі Міхаіла Захарава.

Нагадаем, нягледзячы на тое, што каманда Захарава не выканала мінімальнай задачы — выхаду ў чвэрцьфінал, ён палічыў выступ зборнай задавальняючым. І абрынуўся са зневажальнымі словамі на супернікаў. «Мы зрабілі немагчымае за тыя некалькі дзён, што працавалі разам. Да хлопцаў у мяне прэтэнзій няма ніякіх. Усе свае шайбы мы закінулі ў контратаках. Ніхто столькі не забіў, колькі мы. Усе ў шоку ад нашай гульні, ад яе прыгажосці. Усе мне пра гэта гавораць. Спытайце любога трэнера канадскага ці яшчэ каго. Ніводны з іх не сказаў, што мы дрэнна гуляем. Бенгт-Оке Густафсан (трэнер зборнай Швецыі) мяне пяць разоў павіншаваў», — заявіў Захараў.

«На Алімпіядзе хвараю толькі за Расію. Я сам адтуль (Захараў нарадзіўся ў 1962 годзе ў горадзе Усць-Каменагорск (Казахстан), гуляў у свой час за зборную СССР). Трэба ўсім даказаць, што наш хакей самы найлепшы ў свеце. Усе расійскія трэнеры — мае сябры. Расія нам заўсёды дапамагае ў футболе. А ў канадцаў зусім не працуе галава, у іх мазгоў не хапае. Яны нават каляндар не змаглі нармальна скласці», — заявіў Захараў.

Такія неспартовыя выказванні выклікалі шмат абурэння ў аматараў хакею. Трэнер нацыянальнай зборнай прызнаецца, што хварэе за верагоднага суперніка! Трэнер беларускай зборнай абражае каманду арганізатараў Алімпіяды! Ніколі такога не было ў гісторыі беларускага хакея.

Не будзем зараз спрачацца пра падрыхтоўку зборнай краіны, дзе лядовых палацаў за апошнія гады пабудавана ці не больш, чым супермаркетаў. Хутчэй, трэба задумацца, навошта ў Крымінальным кодэксе існуе артыкул за дыскрэдытацыю Рэспублікі Беларусь.

Калі не крыміналка, то пакаранне заўзятараў хакею Захарава дастане. Шэраг хакейных фанацкіх клубаў ужо абвясцілі пра пачатак кампаніі байкоту Захарава. У сувязі з нездавальняючым выступам нацыянальнай зборнай Беларусі па хакеі на Алімпіядзе ў Ванкуверы спартовая грамадскасць абвясціла кампанію недаверу галоўнаму трэнеру Міхаілу Захараву. У адмысловай заяве гаворыцца, што менавіта пры Захараве склалася заганная сістэма, калі ў галоўнай камандзе гуляюць «блатныя», а тыя, хто насамрэч заслужыў гэта сваёй гульнёй, з асноўнага складу выціскаюцца.

Ініцыятары «імпічменту» нагадваюць, што адзіная перамога падчас Алімпіяды была здабытая ў гульні са зборнай Германіі, якая прадстаўляе зборную ніжэйшага дывізіёну «В», тым часам як камандам Швецыі і Фінляндыі беларусы прайгралі па ўсім. Выхаванцы Захарава ў 1/8 фіналу ў сэры булітаў прайгралі не самым моцным швейцарцам. У звароце гаворыцца, што сам факт знаходжання Захарава на пасадзе трэнера нацыянальнай зборнай уносіць раскол у шэрагі заўзятараў, абсалютная большасць якіх, згодна з апытаннямі, лічаць адстаўку неабходным крокам дзеля ўратавання беларускага хакею.

Бадай, гэта і застанецца ў памяці заўзятараў беларускага спорту.

Атрымалі па шапцы на тыдні і стваральнікі беларускай АЭС. Абурэннем, усеагульнай збянтэжанасцю і бязладнымі дыскусіямі на павышаных тонах завяршыліся 2 сакавіка амаль пяцігадзінныя грамадскія слуханні ў Вільнюскім універсітэце, прысвечаныя ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе (АУНА) будучай беларускай АЭС.

Многія ўдзельнікі раней пакінулі аўдыторыю з прычыны нізкага ўзроўню перакладу, арганізаванага беларускім пасольствам.

«У выпадку, не дай Бог, аварыі, у нас будзе знішчана сталіца, тэрыторыя краіны забруджана на 80 працэнтаў. Чаму нічога гэтага няма ў справаздачы? Гэта ж генацыд літоўскага народа!» — заявіла намеснік старшыні камісіі развіцця Вільнюскага гарадскога савета і прадстаўнік некалькіх грамадскіх арганізацый Раса Навіцкене. «Чаму нам кажуць, што няма наогул ніякай небяспекі? Гэта такое стаўленне да літоўскага народа, што мы такія неадукаваныя і нічога не разумеем? Буду рабіць усё магчымае, каб Літва не ўхваліла такую справаздачу АУНА», — сказала Навіцкене.

З ёй пагадзіўся старшыня экалагічнага таварыства «Атгая» Саўлюс Пікшрыс: «Я падрыхтаваў шмат пытанняў, але па вопыце эксплуатацыі Ігналінскай АЭС убачыў, што няма сэнсу іх задаваць. Тое, што тут казалі, выклікае папросту смех — шмат стройных і працяглых прамоў ні аб чым, на канкрэтныя пытанні адказ дадзены не быў. Слуханне АУНА нельга прызнаць сапраўдным». Падчас імправізаванага галасавання, да абурэння беларускага пасла Уладзіміра Дражына, заява была ўхвалена падняццем рук большасці прысутных у зале. «Па якому праву вы праводзіце галасаванне? Мы яшчэ не прымаем рашэння», — сказаў Дражын. «А мы, сход, ужо прынялі», — заявіла Навіцкене.

Зразумела ж, гэта не грамадскія слуханні ў Астраўцы, дзе можна заарыштаваць усіх нязгодных і пасадзіць іх у кутузку. Там — свабода выказванняў. І наўрад ці такая свабода будзе гучаць суцэльным «адабрамсам».

Зараз літоўская грамадскасць павінна да канца месяца накіраваць сваю рэакцыю ў Міністэрства аховы навакольнага асяроддзя краіны. З улікам гэтых пажаданняў Літва сфарміруе пазіцыю па будаўніцтве Беларуссю АЭС, але правам вета яна, як любая замежная дзяржава, не валодае. Але ж падобныя слуханні павінны прайсці ў іншых краінах — суседзях Беларусі: Латвіі, Польшчы, Украіне, Расіі… І наўрад ці слуханні, прынамсі, у Латвіі, Польшчы і Украіне дадуць іншы вынік. У іх таксама свабода слова і галоснасць.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АЛЯКСЕЙ ГРЫШЫН



Першае ў гісторыі суверэннай Беларусі «золата» ў зімовых Алімпійскіх гульнях атрымаў фрыстайліст Аляксей Грышын. 30-гадовы спартсмен ужо пасля першай спробы меў лепшы вынік з трох беларускіх фрыстайлістаў і другі сярод 12 фіналістаў. Другая спроба ўзнесла Аляксея на першае месца алімпійскага п'едэсталу. «Срэбра» дасталася амерыканцу Джэрэту Пітэрсану, бронза — кітайцу Лю Чжонгіну. Развітвацца са спартовай кар'ерай Аляксей не збіраецца і, калі не будзе пагаршэння са спіной, плануе рыхтавацца да Алімпіяды ў Сочы.

Для Аляксея Грышына гэта былі чацвёртыя Алімпійскія гульні. У японскім Нагана ў 1998 годзе ён быў восьмым, у амерыканскім Солт-Лейк-Сіці атрымаў «бронзу», а ў 2006 годзе ў Турыне заняў чацвёртае месца. Алімпійскае золата Ванкувера–2010 спартовец выйграў там жа, дзе 9 гадоў таму адзіны раз выйграў золата чэмпіянату свету.

Аляксей пачаў свой шлях у спорце з чатырох гадоў як гімнаст, аднак пасля перайшоў у фрыстайл, у якім і дасягнуў вышэйшай вяршыні кар'еры. Па вяртанні ў Мінск спартовец расказаў, што цяпер марыць пра адпачынак ды нараджэнне дзіцяці.

### УЛАДЗІМІР НЯКЛЯЕЎ



Пісьменнік Уладзімір Някляеў ачоліў новую грамадзянскую кампанію пад назвай «Гавары праўду». Яе заснавальнікамі выступілі пісьменнікі Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, грамадскія дзеячы Зінаіда Бандарэнка і Генадзь Грушавы, акадэмік Радзім Гарэцкі, экс-кіраўнік Беларускага Хельсінскага камітэту Таццяна Процька, старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў Жанна Літвіна.

Уладзімір Някляеў, прэзентуючы кампанію, зазначыў, што яе мэта — усведамленне беларускім грамадствам рэальнага стану рэчаў у краіне, дзе «мала месца праўдзе і шмат — мане». Таксама пісьменнік падкрэсліваў, што гэта не палітычная кампанія, а культурная і грамадская ініцыятыва. Ніводная палітычная партыя ці грамадская арганізацыя не ўвайшлі ў грамадзянскую кампанію «Гавары праўду».

Лідэр новастворанай кампаніі расказаў, што да яго неаднаразова звярталіся «нябедныя людзі» з прапановай падтрымаць яго вылучэнне на прэзідэнцкіх выбарах, аднак ён адмовіў. Гэтыя ж «нябедныя людзі», якія жывуць пераважна за межамі краіны, а менавіта ў Расіі, пагадзіліся спансаваць новую грамадскую ініцыятыву.

### СВЯТЛАНА БАЙКОВА



КДБ арыштаваў следчую па асабліва важных справах Генеральнай пракуратуры Беларусі Святлану Байкову. Байкова расследавала справы, звязаныя з карупцыяй у КДБ і міліцыі. У 2000-х гадах следчая вяла справу пра знікненне экс-міністра ўнутраных спраў Юрыя Захаранкі. Праз два гады гэту справу ў Байковай забралі.

Як піша «Ежедневник», арышт звязаны з апошняй справай, якую расследавала Святлана Байкова. Абвінавачванымі па ёй праходзілі былы дырэктар Дэпартамента фінансавых расследаванняў, генерал КДБ у адстаўцы, іншыя высокапастаўленыя асобы, а таксама некалькі дзесяткаў супрацоўнікаў мытні. Таксама выданне са спасылкай на свае крыніцы ў сілавых ведамствах паведамляе, што «справа Байкавай — толькі пачатак. Нібыта КДБ «дадзена каманда «апусціць» пракуратуру і суды», паказаўшы ўзровень карупцыі ў гэтых структурах. Разам з тым ўзгадваецца, што Святлану Байкову калегі ведалі як надзвычай прынцыповага і сумленнага следчага. Прыкладна за месяц да свайго арышту Святлана гаварыла журналісту «Ежедневника», што над ёй згушчаюцца хмары і працаваць у такіх умовах яна больш не можа, таму хоча сысці ў адстаўку.

Генеральны пракурор Рыгор Васілевіч заявіў Інтэрфаксу, што дакладна не ведае, у чым падазраюць супрацоўніка яго ведамства, і выказаў меркаванне, што з боку Байковай маглі быць зафіксаваныя «парушэнні працэсуальнага характару».

За апошні час у Беларусі было некалькі гучных крымінальных спраў з удзелам прадстаўнікоў сілавых ведамстваў. Гэта звязваюць з «вайной» паміж КДБ і МУС, а таксама расчысткай поля для дзейнасці новых лідэраў у атачэнні кіраўніка дзяржавы, у прыватнасці размова ідзе пра Віктара Лукашэнку.

ТРЭЦІ СЕКТАР

# АНТОН АСТАПОВІЧ

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**Прозвішча гэтага чалавека апошнім часам траплялася ў СМІ часцей, чым прозвішчы некаторых вядомых апазіцыянераў. Тлумачыцца гэта тым, што старшыня Таварыства аховы помнікаў Антон Астаповіч знаходзіцца ў апазіцыі не да канкрэтнай асобы, а да таго, як некаторыя ставяцца да нашага мінулага. І не істотна, з якога боку барыкад яны знаходзяцца.**



## Камяні юнацтва

Калі 23 кастрычніка 1964 года ў Асіповічах нарадзіўся хлопчык, то тады ніхто (акрамя Бога, канешне) не мог сказаць, што калісьці гэта немаўля будзе абараняць гістарычную спадчыну нашай нацыі. Магчыма, некаторым такі тэзіс падасца вельмі пафасным, але я, напрыклад, магу няшмат яшчэ прыгадаць асобаў, што не толькі змагаюцца за штосьці канкрэтнае, але час ад часу і перамагаюць.

Пасля школы Антон Астаповіч паступіў у Мінскую медыцынскую вучэльню. Скончыў яе ў 1984 годзе з чырвоным дыпломам і стаў фельчарам. Крыху паспеў папрацаваць на хуткай дапамозе і паступіў у знакаміты мінскі медінстытут, які пры сучаснай уладзе стаў універсітэтам.

Якраз у той момант студэнтаў пачалі прызываць у войска, і дзяржава дала Антону Астаповічу магчымасць два гады падумаць пра свой лёс. А галоўнае — вызначыцца: працягваць далей вучобу або заняцца справай, якая да сэрца была бліжэй.

Восенню 1987 года Антон вярнуўся са службы, забраў дакументы з медінстытута і ўладкаваўся на працу ў чыгуначную бальніцу родных Асіповічаў. А ў 1989 годзе завочна паступіў (у 25 гадоў на стацыянары амаль не навучаюцца) на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Лагічна ўзнікае пытанне: навошта было «гарадзіць агарод» з медыцынай, бо гісторыя заўсёды падабалася больш? Адказ просты — пэўны ціск бацькоў. Людзі сталыя і практычныя, яны не лічылі гісторыю той сферай, дзе заўсёды будзе стабільны (у нашай краіне да гэтага імкнуцца ўсе) кавалак хлеба з маслам. Іншая справа — урач. Дарэчы, браты Грыцкевічы (абодва займаюцца гісторыяй) па адукацыі таксама медыкі…

У новай сферы Астаповічу адразу пашанцавала. Нягледзячы на тое, што ён вучыўся толькі на першым курсе, яго ўжо добра ведалі ў краязнаўчых і гістарычных колах, таму адразу ўзялі ў Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту на пасаду малодшага навуковага супрацоўніка ў аддзел фондаў, а праз год прызначылі загадчыкам сектара Цэнтральнай Беларусі ў экспазіцыйным аддзеле. Гэтаму музею ён аддаў больш за 16 гадоў свайго жыцця.

Пашчасціла (як лічыць сам Астаповіч) таксама ў тым, што ён (калі ўжо быў намеснікам дырэктара музея) некалькі гадоў выкладаў на той кафедры Універсітэта культуры, дзе кіраўніком з'яўляўся Анатоль Пятровіч Грыцкевіч. А дзякуючы кнізе «Факел Гіпакрата» (1987 год) прафесара Грыцкевіча адкрыў для сябе сапраўдную гісторыю беларускай медыцыны.

## Музейныя падмуркі

Большасць памылкова звязвае Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту са Строчыцамі, але дакладней будзе назваць вёску Азярцо, бо гэта яе фактычная ўскраіна. На 150 гектараў музейнай зямлі з усёй Беларусі звазілі і рэстаўравалі помнікі традыцыйнай народнай архітэктуры.

Калі ў 2006 годзе Антон Астаповіч з музею звальняўся, шмат хто ўбачыў у гэтым нейкае палітычнае адценне, бо менавіта тады праходзілі прэзідэнцкія выбары. І гэта цалкам зразумела. Антон Астаповіч — даўні сябра Партыі БНФ. Нават у 1989 годзе прысутнічаў (ад Асіповічаў) на ўстаноўчым з'ездзе ў Вільні. І ў ніякія палітычныя структуры больш не ўваходзіў.

За гэтыя 16 гадоў працы ў музеі Антон Астаповіч і сфарміраваўся як адзін з самых вядомых у краіне спецыялістаў гэтай галіны, але я засяроджу ўвагу толькі на некаторых эпізодах.

Першы з іх датычыць адной з экспедыцый, у якіх супрацоўнікі музея займаліся выяўленнем і фіксацыяй помнікаў драўлянай архітэктуры, зборам этнаграфічнага (вуснага) матэрыялу, прадметаў музейнага значэння. З 1990 па 1996 год, калі было нармальнае фінансаванне, такіх экспедыцый ладзілася даволі шмат.

У верасні 1991 года была прынятая новая нацыянальная сімволіка, і бел-чырвона-белы сцяг стаў дзяржаўным. Праз месяц адбылася экспедыцыя ў Клецк. Астаповіч з калегамі засяліўся ў гатэль, а насупраць — райвыканкам, над якім вісела нешта чырвона-зялёнае. І калі навукоўцам адзначалі нешта камандзіровачных лістах, Антон запытаўся: «А чаму вы парушаеце законы незалежнай Беларусі? Чаму ў вас вісіць тое, што адмянілі больш за месяц таму?»

Якая ж узнялася мітусня! Астаповіча завялі да намесніка райвыканкама, і той пачаў апраўдвацца: бачыце, там дым ідзе, латаем усё бітумам, баімся, каб новы сцяг не пакрыўся сажай, праз 3–4 дні скончым усе работы… Спалохаўся ён так, што тэрміны былі значна скарочаныя, і ўжо праз некалькі гадзін над будынкам лунаў дзяржаўны сцяг. З гэтай нагоды Антон Астаповіч заўсёды жартуе, што над Клецкам у 1991 годзе бел-чырвона-белы сцяг узняў менавіта ён.

Самае цудоўнае ў экспедыцыях — сустрэчы з людзьмі, якія жывуць у беларускай глыбінцы. Напрыклад, у Шчучынскім раёне вучоным сустрэўся 80-гадовы дзед, які некалі быў польскім уланам і ўмеў крыху маляваць. У хаце вісеў намаляваны алеем аўтапартрэт, дзе ён на кані, а побач — маршал Пілсудскі.

У экспедыцыях Беларусь у нейкім сэнсе адкрываецца па-новаму. Як лічыць сам Астаповіч, не было б іх, не было б і яго знакамітых вандровак, бо падмурак быў закладзены тады, калі ён аб'ездзіў 85 працэнтаў Беларусі і ўбачыў усе найбольш значныя гістарычныя каштоўнасці.

Такіх людзей у Беларусі адзінкі…

## Ідэалагічны фундамент

Гэта цяжка ўявіць, але пэўны час Антон Астаповіч афіцыйна быў «галоўным ідэолагам» свайго музею. У 2002 годзе яго прызначылі намеснікам дырэктара па навуцы, а ў 2004 годзе з Міністэрства культуры прыйшоў загад, які патрабаваў ускласці на аднаго з намеснікаў дадатковы абавязак — адказнага за ідэалогію. Акрамя Астаповіча ў дырэктара было яшчэ два намесніка — па будаўніцтву і рэстаўрацыі, гаспадарцы. Да таго ж узрост у іх быў ужо пенсійны. Якая тут ідэалогія? Таму цалкам зразумела, што іншага выбару папросту не было.

Міністэрства гэта зацвердзіла, і нават калі ў 2006 годзе месца былога дырэктара заняла (яна потым і «з'ела» Астаповіча) новая начальніца, «ідэалогію» ў яго не адабралі. Дарэчы, да тых абавязкаў ён і сёння ставіцца вельмі станоўча, бо, па вялікаму рахунку, там ёсць толькі тое што, закладзена ў Праграму Партыі БНФ — правы чалавека, нацыянальны характар дзяржавы, спадчына і г.д. Хто не верыць, хай адкрые любы афіцыйны падручнік. Пра лізаблюдства перад існуючым кіраўніцтвам там нічога няма. Гэта сучасныя чыноўнікі бачаць «паміж радкамі»…

Свой светапогляд Антон Астаповіч не хаваў ніколі, таму спакойна ставіўся да спроб убачыць у яго дзеяннях нейкую палітыку або пазбавіць ідэалагічнага чынніка. А былі яны неаднойчы, аднак заўсёды разбіваліся аб логіку мясцовага (вельмі прафесійнага) юрыста. Напрыклад, той «на пальцах» растлумачыў, што «забраць ідэалогію» магчыма толькі ў адным выпадку — у сувязі з павелічэннем нагрузкі па навуковай лініі з захаваннем службовай надбаўкі, бо дзейнічае Астаповіч у строгай адпаведнасці з існуючым падручнікам па ідэалогіі.

Імкненні ж былі супрацьлеглымі. Калі не атрымлівалася звольніць, трэба было зрабіць так, каб Астаповіч сышоў сам. І грошы тут — не апошні аргумент.

1 верасня 2006 года так і адбылося. Нягледзячы на тое, што праз некалькі дзён (9 верасня) музей святкаваў 30 гадоў з дня свайго стварэння, Антон Астаповіч напісаў адпаведную заяву і забраў працоўную кніжку.

І з таго часу быў там усяго два разы. Адзін раз — выпадкова ў 2007 годзе, калі ў тых мясцінах здымалі фільм з яго ўдзелам. А другі — у жнўні 2009-га, калі праводзіў міжнародны валанцёрскі летнік і прыехаў туды ў рамках чарговай вандроўкі.

## Дзеля будучыні — у мінулае

Яшчэ ў 2004 годзе Антон Астаповіч пачаў супрацоўнічаць з адной незалежнай тэлестудыяй. Пісаў сцэнары, выступаў у якасці ўдзельніка, эксперта. Плюс удзел у розных творчых праектах (публічныя лекцыі, арганізацыя валанцёрскіх работ), плюс знакамітыя вандроўкі па Беларусі. Да таго ж па характару Антон лёгкі на пад'ем, таму звальненне са стабільнай працы не з'явілася для яго нейкай жыццёвай трагедыяй.

Галоўным яго клопатам стала Таварыства аховы помнікаў (ТАП). Арганізавалі яго яшчэ ў савецкія часы, у 1966 годзе. Фармальна ў гэтым таварыстве Астаповіч з гадоў дзесяці, бо тады запісвалі ўсіх школьнікаў, а актыўна супрацоўнічае з гэтай арганізацыяй з 1990 года, калі пачаў працаваць у музеі і стаў валанцёрам. З паплечнікамі ён нават заснаваў моладзевую секцыю.

7 чэрвеня 2007 года на чарговым справаздачным з'ездзе Антона Астаповіча абралі старшынёй ТАП, і з таго часу ён займаецца (словы самога Астаповіча) «праваабарончай дзейнасцю» — адстойвае права нашай спадчыны на існаванне.

А абараняць, на жаль, ёсць што. Пры досыць неблагім заканадаўстве ў гэтай галіне амаль цалкам адсутнічаюць механізмы правапрымянення законаў. У дзяржавы нават няма паўнавартаснай інспекцыі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. У той жа Літве толькі ў цэнтральным апараце Дэпартамента аховы помнікаў працуе амаль 120 чалавек. Плюс чалавек 50 рэгіянальных інспектараў. Тое ж самае ў Польшчы. І нават у Азербайджане.

У штаце Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ёсць 15 адзінак. Фактычна там працуе 11 чалавек. А ўсе рэгіянальныя інспектары (у нагрузку да галоўнай дзейнасці) падпарадкоўваюцца і цалкам залежаць ад мясцовай выканаўчай улады, якая часцей за ўсё і з'яўляецца першым парушальнікамі заканадаўства аб ахове спадчыны. Пры такой сістэме ніякі рэальны кантроль немагчымы.

Адзінае выключэнне — тое, што робіць Таварыства аховы помнікаў, якое з'яўляецца цалкам грамадскай структурай. ТАП перашкаджае самавольству чыноўнікаў, і ў выканаўчай улады яно як бяльмо на воку.

Калі параўнаць музейныя экспедыцыі Антона Астаповіча і яго знакамітыя вандроўкі, то атрымаецца, што страцілі мы за апошнія гады даволі многа. Перш за ўсё — сядзібна-паркавыя комплексы. Раней іх было даволі шмат, а зараз амаль не засталося. Згодна з зацверджаным Саўмінам у мінулым годзе планам развіцця экатурызму, інвестары могуць набыць толькі 45 аб'ектаў, а іх у Беларусі некалькі сотень. І хто можа даць гарантыю, што там не будзе нешта лубочнае, накшталт Траецкага прадмесця?..

Пра вандроўкі, якія ладзіць Антон Астаповіч, можна распавядаць доўга, таму я абмяжуюся толькі некаторымі лічбамі і фактамі.

Напрыканцы 2002 года ён з аднадумцамі стварыў незарэгістраваную ініцыятыву «Беларускі шлях» і пачаў ладзіць «Вандроўкі ў мінулае», бо традыцыйныя турыстычныя маршруты «ахапляюць» толькі 10 працэнтаў таго, што ёсць у нашай краіне. У 2007 годзе Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» далучылася да арганізацыі вандровак. Па самых сціплых падліках, іх ужо адбылося больш за дзвесце.

Па ўсёй Беларусі сёння сябрамі ТАП з'яўляецца 1800 чалавек. Значная сіла. Прычым не патэнцыйная, а наяўная. ТАП шмат робіць ужо сёння…

З НАГОДЫ

# П'ЮЦЬ, ГВАЛТУЮЦЬ, ЗАБІВАЮЦЬ

Генадзь КЕСНЕР

**Больш за 80 працэнтаў забойстваў і згвалтаванняў, а таксама больш за 40 працэнтаў асабліва цяжкіх злачынстваў у Беларусі здзяйсняецца ў стане алкагольнага ап'янення. Пра гэта 2 лютага падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай надыходзячаму Дню міліцыі, заявіў першы намеснік міністра ўнутраных спраў Беларусі Алег Пякарскі.**

«Увогуле, калі меркаваць па колькасных і якасных паказчыках дынамікі злачынстваў у Беларусі, то можна сказаць, што наша грамадства робіцца лепей», — адзначыў першы намеснік кіраўніка беларускага МУС. Паводле яго слоў, калі ў 2006 годзе была заведзена 181 тысяча крымінальных спраў, то ў 2009 — 146 тысяч. Тым не менш, падкрэсліў Алег Пякарскі, сітуацыя па-ранейшаму застаецца напружанай, «і мы не кажам пра тое, што ўжо найбліжэйшым часам дасягнем таго ўзроўню, калі ў грамадстве надыдзе поўная ідылія».

Што да статыстыкі забойстваў, то калі ў 2000 годзе было здзейснена 1186 такіх злачынстваў, у 2009-м — удвая менш — 570. Летась нераскрытымі засталіся 17 забойстваў, сказаў высокапастаўлены міліцэйскі чыноўнік.

Паводле слоў Алега Пякарскага, больш за 40 працэнтаў злачынстваў у Беларусі здзяйсняецца ў стане алкагольнага ап'янення, а такіх злачынстваў, як згвалтаванні, нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў, забойствы, — больш за 80 працэнтаў. Апроч таго ад атручвання алкаголем у Беларусі штогод памірае каля 2,5 тысяч чалавек. Што да станоўчых тэндэнцый, то Алег Пякарскі адзначыў зніжэнне ўзроўню злачыннасці сярод няпоўнагадовых.

Першы намеснік кіраўніка МУС пацвердзіў інфармацыю пра тое, што Камітэтам дзяржаўнай бяспекі затрымліваўся брат былога камандзіра вайсковай часткі 3214 Дзмітрыя Паўлічэнкі. Гэта было звязана з крымінальнай справай, распачатай па факце знікнення наркатычных рэчываў з Рэспубліканскага турэмнага шпіталю, які падпарадкоўваецца Дэпартаменту выканання пакаранняў. Брата Паўлічэнкі пакуль адпусцілі, следства па гэтай справе працягваецца.

Алег Пякарскі таксама пацвердзіў, што зараз вядзецца вышук начальніка Упраўлення ўнутраных спраў Гродзенскага аблвыканкама генерал-маёра Генадзя Хацько, супраць якога была заведзена крымінальная справа за перавышэнне службовых паўнамоцтваў. Адзін з эпізодаў гэтай справы — незаконнае будаўніцтва спадаром Хацько катэджу. Па словах Алега Пякарскага, на дадзены момант не вядома, знаходзіцца Генадзь Хацько на тэрыторыі Беларусі ці па-за межамі краіны.



Адказваючы на пытанне пра перашкоды журналістам весці фота- і відэаздымкі падчас вулічных акцый, якія чыняць супрацоўнікі праваахоўных органаў, Алег Пякарскі адзначыў: «Любы чалавек, якога здымаюць, мае права абурыцца і не пагадзіцца з тым, што яго здымаюць. Гэта права супрацоўніка міліцыі, калі яму не хочацца, каб яго здымалі, калі яму нецікава, каб яго твар выкарыстоўваўся ў карцінках, якія часта ствараюцца і ідуць за межы Рэспублікі Беларусь, а потым у розных СМІ паказваюцца масавыя беспарадкі і дзеянні канкрэтнай асобы. Мы не думаем пра тое, што ў яго ёсць сям'я, ёсць дзеці, што на гэта глядзяць яго блізкія. На жаль, часта карцінка ствараецца дзеля таго, каб паказаць, наколькі тут няправільна дзейнічаюць супрацоўнікі міліцыі. Таму я згодны з тым, што павінны быць выпрацаваны правілы пры правядзенні і пры рэагаванні, каб вы разумелі нарматыўную базу дзеянняў супрацоўнікаў міліцыі і якія задачы перад імі стаяць, і калі вы маеце жаданне засведчыць тое ці іншае мерапрыемства, рэальна разумелі, што вы сваімі дзеяннямі ў нейкай ступені правакуеце (міліцыянтаў), хаця ведаеце, што ўсё, што адбываецца, гэта супрацьзаконна».

У сваю чаргу, прысутная на прэс-канферэнцыі начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязей Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Святлана Бароўская паведаміла, што ў Беларусі пакуль не плануецца ўводзіць інстытут прэс-афіцэраў паводле нямецкага ўзору. «Нямі пераймаецца вопыт розных акцый, якія праводзіцца ў Германіі, але на сённяшні дзень пакуль гаворка аб прэс-афіцэрах у нас не вядзецца, — сказала Святлана Бароўская. — Магчыма, тое здарыцца пазней, калі гэта будзе мэтазгодна».

Гаворачы пра ход расследавання крымінальнай справы па факце выбуху, які адбыўся непадалёк ад стэлы «Мінск — горад-герой» у цэнтры беларускай сталіцы ў ноч з 3-га на 4-е ліпеня 2008 года, калі ладзіўся канцэрт з нагоды Дня Незалежнасці Беларусі, Алег Пякарскі падкрэсліў, што следства працягваецца, але канкрэтных падазраваных пакуль няма. Першы намеснік міністра ўнутраных спраў прывёў цікавыя факты.

«Падчас расследавання справы па выбуху мы раскрылі больш за 4 тысячы іншых злачынстваў. Па гэтай крымінальнай справе дапытаныя больш за 900 чалавек, у якасці падазраваных затрымліваліся больш за 120 чалавек, праведзена каля 600 ператрусаў, канфіскавана каля 150 кілаграмаў выбуховых рэчываў, выяўлены шэраг дастаткова сур'ёзных злачынных груповак, якія займаліся вырабам выбуховых рэчываў і выбуховых прылад. Ужо апытана каля 81 тысячы чалавек з тых, хто знаходзіўся ў раёне правядзення свята ў ноч на 4 ліпеня 2008 года. Мы вынялі ўсе фотаздымкі, што былі зроблены падчас святкавання і якія прыносілі самі грамадзяне, з мэтай устанавіць вінаватага. Мы высветлілі ўсіх асоб, якія ёсць на фотаздымках, — хтосьці суседа фатаграфаваў, хтосьці — грамадзяніна, які праходзіў міма. Апаратыўная праца па гэтай справе працягваецца», — сказаў Алег Пякарскі.

Скарыстоўваючы магчымасць, Алег Пякарскі і Святлана Бароўская павіншавалі ўсіх супрацоўнікаў праваахоўных органаў з надыходзячым іх прафесійным святам — Днём міліцыі.

**Ад рэдакцыі:** А ці не супрацьзаконна сілавымі метадамі разганяць мірныя акцыі, закрываць тэле- і фотакамеры, тым больш вырываць іх з рук, збіваць з ног журналістаў, затрымліваць іх і адвозіць у пастарунак, а потым саджаць на суткі па надуманых абвінавачваннях? Найперш трэба адказаць на гэтыя пытанні і выходзячы з гэтага выпрацоўваць правілы ўзаемных паводзін. Але добра, што міліцыянтам сорамна за свае дзеянні перад роднымі і блізкімі. Значыць, не ўсё безнадзейна ў справе ўсталявання ў Беларусі адносін прававой дзяржавы.

КАМПАНІЯ

# СУПРАЦЬ ПАВЫШЭННЯ

Генадзь КЕСНЕР

**У сядзібе Партыі БНФ у апошні дзень зімы прайшоў сход па стварэнню ініцыятыўнай групы, якая мае намер правесці рэферэндум супраць павышэння мытных пошлін на іншамаркі. Адпаведныя дакументы да 25 сакавіка будуць пададзеныя для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы ў Цэнтральную камісію Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў.**

У сходзе ўзялі ўдзел прадстаўнікі ўсіх абласцей Беларусі. Як адзначаюць ініцыятары правядзення плебісцыту, аўтамабіль — ужо даўно не раскоша, але важная частка сямейнай гаспадаркі. Аднак, як сказаў у сваім выступе перад прысутнымі старшыня Партыі БНФ Аляксей Янукевіч, гэты сродак перамяшчэння можа зноў стаць недаступным для большасці беларусаў.

«Мы сабраліся дзеля таго, каб не дапусціць падвышэння мытаў на ўвоз легкавікоў у Беларусь, якое запланавана на 1 ліпеня 2010 года, для фізічных асоб. Гэты крок можа стацца моцным ударам па бюджэце кожнай беларускай сям'і. Гэты ўдар па кішэні кожнага беларуса будзе непараўнальны з тым ударам, які адбыўся падчас леташняй дэвальвацыі беларускага рубля… Беларускіх інтарэсаў у гэтым рашэнні абсалютна няма. Гэта невыгодна ані спажыўцам, якія карыстаюцца аўтамабілямі, ані гандлярам, ані беларускаму бюджэту, які, па ацэнках спецыялістаў, страціць вялікія грошы пасля павелічэння гэтых мытаў», — падкрэсліў Аляксей Янукевіч.

Словы палітыка пацвярджаюцца нават публікацыяй у дзяржаўнай «Народнай газеце» ад 30 кастрычніка 2009 года, дзе сцвярджаецца, што «паводле экспертных ацэнак, страты беларускага бюджэту на аўтамабільных пошлінах пасля фарміравання Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана могуць скласці 200 мільёнаў долараў».

Як адзначаюць ініцыятары арганізацыі рэферэндуму, раней для беларусаў аўтамабіль да 10 гадоў лічыўся прымальным і паводле цаны, і паводле якасці — шмат хто з беларусаў абірае варыянт яшчэ нестарой іншамаркі як альтэрнатыву дарагім мадэлям з аўтасалонаў. Але павышэнне мытных пошлін балюча ўдарыць і па тых, хто разлічвае на танны патрыманы аўтамабіль, і па тых, хто прыглядвае новае аўто ў фірменным салоне.

Напрыклад, «Фольксваген Пасат» 2005 года выпуску з аб'ёмам рухавіка 2000 кубічных сантыметраў цяпер каштуе 11 500 долараў, а пасля 1 ліпеня абыдзецца пакупніку ў 21 380 — амаль удвая даражэй. Яшчэ адзін прыклад: «Форд Фокус» 2008 года выпуску зараз можна набыць за 17 700 долараў, а пасля 1 ліпеня ён «пацягне» на 21 420 «зялёных».

Такім чынам, улады фактычна прапануюць грамадзянам набываць патрыманыя аўтамабілі па коштах новых, і шмат для якіх сем'яў уласнае аўто зноў, як і за савецкім часам, зробіцца недасяжнай марай, а бюджэт краіны згубіць істотныя сумы.

Да ініцыятывы Партыі БНФ аб правядзенні рэферэндуму супраць павышэння мытаў на іншамаркі вырашыў далучыцца і Рух «За свабоду», пра што падчас сходу заявіў яго лідар Аляксандр Мілінкевіч.



«Будзе няпроста, бо давядзецца сабраць велізарную колькасць подпісаў людзей, але я спадзяюся, што да нас — да актыўных грамадзян, да партыйных і грамадскіх лідэраў — далучацца і звычайныя людзі, бо гэтая справа тычыцца непасрэдна і іх… Улада робіць такія захады таму, што яна не клапоціцца пра людзей, пра іх дабрабыт. Улада турбуецца пра сваё самаіснаванне. У іх, у адрозненне ад нас, няма ідэалогіі. Улада не мае стратэгіі для развіцця краіны, у іх ёсць толькі тактыка самавыжывання, і Мытны саюз — гэта спроба выжыць, бо эканамічная мадэль, якую яны стварылі, прадукуе тое, што цяжка прадаць, што можна ўладкаваць яшчэ хіба ў Казахстане і Расіі. Яны зацягваюць мадэрнізацыю эканомікі, а гэты Мытны саюз яшчэ мацней ўдарыць па нашых магчымасцях увайсці ў еўрапейскую эканамічную прастору — там наша перспектыва, там наша будучыня. А мы зараз ставім на гэтым вялікую заслону», — падкрэсліў Аляксандр Мілінкевіч.

Апрача Руху «За свабоду», ініцыятыву Партыі БНФ падтрымалі незарэгістраваны Рух салідарнасці «Разам», а таксама грамадзянская ініцыятыва «За аўто!».

Старшынёй рэспубліканскай ініцыятыўнай групы па правядзенню рэферэндуму супраць павышэння мытаў на іншамаркі ўдзельнікі сходу абралі намесніка старшыні Партыі БНФ Ігара Лялькова. На сходзе былі абраны таксама і кіраўнікі абласных і мінскай гарадской ініцыятыўных груп па правядзенню плебісцыту.

ПАМЯЦЬ

# КАЛІ НЕ Я, ТО ХТО?

Вольга ХВОІН

**2 сакавіка адзначаліся ўгодкі аднаго з буйнейшых пагромаў Мінскага гета. Цяпер мерапрыемствы па ўшанаванню памяці загінулых праводзяцца ў адкрытую. На пачатку 2000-х на месцы масавага пахавання забітых габрэяў побач са сціплым помнікам быў усталяваны мемарыял, да якога наведваюцца і простыя людзі, і дыпламаты, і палітыкі. Але за савецкім часам быў перыяд, калі прыходзіць да гэтага месца было не прынята, адмаўляліся слова «гета» і само паняцце Халакосту. Хаця і тады ацалелыя вязні гета прыходзілі на Яму, каб аддаць даніну памяці сваім суайчыннікам. Адны іх асуджалі, другія падтрымлівалі. Як і ў часы вайны: хтосьці расстрэльваў габрэяў, а хтосьці карміў і хаваў, рызыкуючы сабой і сваім жыццём.**



Дырэктар Музея гісторыі і культуры габрэяў Беларусі Іна Герасімава



Праведнік свету Мікалай Кісялёў. Былы камандзір партызанскага атрада «Мсцівец», які ў 1942 г. вывеў з в. Далгінава за лінію фронта 218 габрэяў

У 1953 годзе ў Ізраілі быў прыняты закон пра стварэнне Мемарыяльнага інстытута Катастрофы і Гераічнасці еўрапейскага габрэйства Яд Вашым, што перакладаецца як Памяць і Імя. У статуце Яд Вашым ёсць радок пра неабходнасць увекавечыць подзвіг Праведнікаў народаў свету — людзей, якія рызыкавалі сваімі жыццямі, каб выратаваць габрэя. Як гаворыцца ў Талмудзе: «Чалавек, які выратаваў адно жыццё, выратаваў усё чалавецтва».

У Беларусі ганаровае званне Праведнікаў народаў свету прысвоена больш чым шасцістам асобам. Першыя беларусы — Андрэй Станько і яго жонка Наталля, якія жылі ў вёсцы Рэчкі Крывіцкага раёна Мінскай вобласці, — атрымалі званне Праведнікаў свету ў 1965 годзе за выратаванне імі сям'і Элі Казінца. Аднак атрымаць дыплом і медаль Праведнікаў яны не мелі магчымасці з-за разарваных дыпламатычных сувязяў паміж СССР і Ізраілем. Толькі ў 1994 годзе, калі ў Мінску ўжо працавала пасольства Дзяржавы Ізраіль і саміх Праведнікаў не было ў жывых, іх дачка забрала дакументы, якія пацвярджалі званне яе бацькоў. Першае публічнае прысваенне звання Праведніка беларусу адбылося ў 1967 годзе. Антаніну Габіс з вёскі Васілішкі Шчучынскага раёна выратаваная ёй Этэль Кравец запрасіла да сябе ў госці ў Ізраіль. Савецкія ўлады дазволілі гэту паездку, у Ізраілі жанчына атрымала ўзнагароду і сваімі рукамі пасадзіла дрэва на Алеі Праведнікаў.

* * *

Ужо ў наш час была выдадзена кніга «Праведнікі народаў свету Беларусі», у якую ўвайшлі гісторыі і імёны пяцісот чалавек. Сваім меркаванне падзялілася аўтарка кнігі **Іна Герасімава**, кандыдат гістарычных навук, дырэктар Музея гісторыі і культуры габрэяў Беларусі.

— На пытанне, чаму адны рабілі так, а другія інакш, ніхто не адкажа. Мы можам толькі гаварыць у цэлым, што адны прадавалі, а іншыя — ратавалі. Ніхто не ведае пасыл чалавека, калі перад ім стаіць у крыві, абарваны габрэй, і трэба вырашыць за хвіліны, ці пакінуць яго ў сябе, ці даць хлеба і зачыніць дзверы. Некаторыя лічаць, што беларусы — добры, талерантны народ. Так, але народ складаецца з людзей, і ўсе яны розныя. Польшча, якая іншымі лічылася антысеміцкай краінай, дала тры тысячы праведнікаў. Ёсць праведнікі і ў Літве, і ў Германіі. Хіба можна зразумець, чым кіраваліся тыя немцы, калі агулам існавала ідэя, што габрэі — ворагі? Гэта выключна пытанне чалавечнае і, на мой погляд, рэлігійнае. Аднойчы ў 1990-я ўручалася пасведчанне Праведніка сялянцы, і ў яе запыталіся, ці мае яна нешта сказаць. Жанчына падышла да мікрафона і прамовіла: «Дзякуй габрэям, якія далі нам Хрыста». Такім чынам яна, рэлігійная жанчына, спрабавала аддзячыць народу, які даў ёй веру. Мне падалося пытанне «чаму?» нетактоўным.

Мяне ўразіла адна жанчына. У вайну ёй было 14 гадоў, жыла яна з сястрой і яе мужам. Яшчэ да вайны сястры дапамог доктар-габрэй. Калі стварылі гета, сястра папрасіла яе знайсці таго доктара і чым-небудзь яму дапамагчы. Гэта дзяўчынка чапляла зорку Давіда і ішла ў гета. Я пыталася, няўжо вы не баяліся, не разумелі, што вас могуць застрэліць? На што пачула адказ: калі не я, то хто іншы дапамог бы яму?

Ёсць выпадкі, калі габрэяў ратавалі цэлымі вёскамі. Жанчыну-габрэйку, урача, ратавала па чарзе ўся вёска. Усе ведалі, хто яна такая, але ўсе маўчалі. Не думаю, што кожны з гэтых людзей быў ідэальным, але ніхто не выдаў гэту габрэйку. Гэта нават больш сур'ёзна, чым выпадкі, калі ратавалі дзяцей, бо іх заўжды больш шкада, у пэўнай ступені і лягчэй гэта рабіць.

Мне падаецца, што няма іншага народу, які б ставіўся так добра да габрэяў, як беларусы. Нават самі габрэі да сябе кепска адносяцца. У адной з паездак па Беларусі, калі мы шукалі пахаванні габрэяў, мясцовая жанчына правяла нас да могілак. І калі пачала называць іх імёны, проста расплакалася наўзрыд. І толькі прыгаворвала: «Вы б ведалі, як іх вялі па вуліцы». Яна бачыла, як гэтыя габрэйскія сем'і вялі на расстрэл. Не думаю, што можна знайсці многа людзей, якія так шчыра будуць плакаць, згадваючы сваіх суседзяў-габрэяў.

***— Гісторыкі сцвярджаюць, што фашысцкая ідэалогія, заснаваная на махровым антысемітызме і татальным знішчэнні габрэяў, за гады акупацыі здолела паўплываць і на адносіны мясцовага насельніцтва да габрэяў. Ужо пасля вайны праявіўся антысемітызм на ўзроўні савецкіх уладаў. Таму, калі паўстала пытанне пошуку Праведнікаў, габрэі, якія выжылі ў акупацыі, не пісалі ў анкетах, не згадвалі ў размовах пра тое, што знаходзіліся ў гета. І людзі, якія ратавалі габрэяў у гады вайны, імкнуліся схаваць гэтыя факты. Часам і сёння падчас размовы Праведнікаў з прадстаўнікамі габрэйскіх арганізацый, якія хочуць правесці цырымонію ўзнагароджання па месцы жыхарства Праведніка, можна пачуць словы: «Лепш прыеду ў Мінск для ўзнагароджання. Тут не трэба распавядаць, што я ратаваў габрэяў»...***

— Адна з найбольш відавочных падстаў нелюбові да габрэяў — рэлігійная. І яна — адна з мацнейшых. Нават у нашы дні я асабіста чула ў цэрквах пропаведзі, калі габрэі наўпрост называюцца ворагамі. Габрэі іншыя, і паводле знешнасці, і паводле гістарычна-культурнай традыцыі. Паняцце «іншы» для многіх тоесны паняццю «вораг». Габрэі жылі на чужой тэрыторыі, захоўвалі свае традыцыі, не асімілёўваліся, і гэта толькі падагравала нелюбоў. Я не гавару пра канкурэнцыю, зайздрасць. Калі габрэі з'явіліся ў Еўропе, то пачалі займацца банкамі, займаць вольныя нішы. І нікога не хвалюе, што ты, магчыма, працуеш штодня. Пасля вайны бытавы антысемітызм пашырыўся. Сярод габрэяў было многа камуністаў. Не больш, чым іншых, але гэта, канешне, кідаецца ў вочы. Габрэі ўваходзілі ў рэвалюцыю з чаканнем, што яна знішчыць усе класавыя і этнічныя абмежаванні. А калі селянін прыходзіў у райвыканкам, і перад ім сядзеў начальнік, які наперш асэнсоўваў сябе з уладай, і ў нечым адмаўляў, то ў чалавека складвалася ўражанне, што гэта яго, габрэя, рашэнне. Таму заклік «Забі габрэя!» меў на ўвазе — забі ўладу. Нават выраз быў — жыдабальшавікі.

***— Асабіста вы сутыкаліся з антысемітызмам?***

— Канешне. Бытавы антысемітызм захоўваецца да гэтага часу. Можна змяніць палітычны лад, але значна цяжэй змяніць ментальнасць людзей. Мой бацька рускі, а сама я вырасла ў Беларусі, ведаю мову, культуру. Але, як гаворыцца, б'юць не па пашпарту, а па мордзе...

***— Сёння раз-пораз можна пачуць словы, што габрэі ўсё надумалі самі — і маштабы трагедыі, і Халакост.***

— Адмаўленне Халакосту — модная з'ява. Але робіцца гэта з выключна палітычнымі мэтамі, каб падкрэсліць, што габрэі не патрэбныя і някепска было б з імі і зараз разабрацца. Тыя, каго няма, нічога пра Халакост расказаць не могуць. Хто засталіся — гавораць, але нясмела. Савецкі генерал Васіль Пятрэнка, калі прыйшоў са сваімі войскамі ў Асвенцым, быў уражаны ўбачаным. Так, там знішчаліся ўсе, але, калі больш за 80 працэнтаў вязняў — былі габрэі, то не магчыма пра гэта маўчаць. Шэсць мільёнаў забітых габрэяў, якіх знішчылі толькі за тое, што яны такімі нарадзіліся, — хіба гэта не Халакост?

***— Ці падтрымлівае беларуская дзяржава вашу працу ў пошуку Праведнікаў, ці дапамагае развіваць габрэйскую культуру?***

— У нас ёсць праект па ўшанаванню памяці, які прадугледжвае ўсталяванне на месцах знішчэння габрэяў памятныя знакі. З дапамогай фонду Лазарусаў было ўстаноўлена каля сарака такіх знакаў. Падчас адзначэння 65-годдзя Мінскага гета з дапамогай дзяржавы было пастаўлена некалькі помнікаў у Мінску на месцах масавага пахавання габрэяў. Мы выдалі першую кнігу «Праведнікі народаў свету Беларусі». На другое, дапоўненае выданне пакуль няма сродкаў. Нядаўна пры падтрымцы Нацыянальнага архіва Беларусі была выдадзеная кніга «Сведчаць каты. Знішчэнне габрэяў на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг.». Што тычыцца культуры, то сёння ніхто не абмежаваны ў развіцці культуры, іншая справа, што гэтае развіццё ідзе толькі за кошт саміх нацыянальнасцяў.

***— Наколькі габрэйская культура адкрытая да абмену, супрацоўніцтва?***

— Быў перыяд, калі габрэйская нацыянальная культура не прызнавала ніякіх іншых культурных дадаткаў. Ёй трэба было выжыць, а для гэтага нельга было змешвацца з іншымі, бо гэта прывяло б да асіміляцыі. Але паколькі габрэйская культура не жыве сёння аўтаномна, ёсць адбор... Але важна разумець, што такое габрэйская нацыянальная культура. Сёння гэта ў першую чаргу культура на мове іўрыт — менавіта Ізраіль, культура, якая там захавалася. Ідыш сёння мала хто ведае, нямнога засталося і з народнай творчасці. Але засталася рэлігія. І менавіта яна дае нацыянальную самасвядомасць. Не абавязкова, што чалавек мусіць быць рэлігійным, але звычайна прытрымліваецца нейкіх агульных традыцый, нормаў.

Беларусь з вынішчэннем габрэйства страціла вельмі многа, цэлы культурны слой. Многія беларусы добра ведалі ідыш, бо суіснавалі ў адной прасторы з габрэямі і мусілі ведаць мову адно аднаго, каб камунікаваць. У нас у Бабруйску па суседству жыла сям'я, якая размаўляла на ідыш. Я заўжды лічыла іх габрэямі, і толькі калі мы выраслі, выпадкова даведалася, што яны — беларусы. Калі сёння ўявіць, што Беларусь — толькі для беларусаў, мне падаецца, гэта будзе вельмі сумным. Калі ў сям'ю, род не трапляе новая кроў, новыя нацыі, то адбываецца паступовае выраджэнне. Так і тут — напаўненне іншымі культурамі нацыянальнай культурай вельмі важна.

Цяперашні перыяд у развіцці габрэйскай культуры ў Беларусі вельмі складаны. Узнікла новая габрэйская культура на рускай мове. Гэта нонсэнс. Бо ў прынцыпе калі няма мовы, то і няма культуры.

***— Тое ж можна сказаць і пра беларускую культуру...***

— На жаль, так. Я вельмі засмучоная, што ў Беларусі дзве мовы. Я лічу, што мусіць быць адна — беларуская. Памятаю той момант, калі беларуская была абвешчана дзяржаўнай, і людзі пачалі размаўляць, чытаць... а пасля аб'явілі другую. Не хочацца ўлазіць у гэта, але ж цяпер не засталося нават беларускіх школ. Нядаўна ў метро маленькая дзяўчынка размаўляла з татам па-беларуску. Увесь вагон змоўк і слухаў іх. Але чаму гэтая праблема нікога не хвалюе? Баюся, што аднойчы ААН запытаецца ў нас, чаму мы называемся Беларуссю, калі няма мовы.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 8 САКАВІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

1

**03.30** 82-я цырымонія ўручэння прэміі «Оскар». Прамая трансляцыя.
**07.00** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**07.50** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05** «Зорныя танцы». Мужчынскі сезон. Перадача 4-я.
**10.25** Меладрама «Прапаноўваю руку і сэрца» (Расія).
**12.10** Камедыйная меладрама «Аднойчы дваццаць пасля» (СССР).
**13.35** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**14.30** Відэафільм АТН «Крыжаноўская Ганна» цыклу «Лёгка сказаць».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «Шум у шафе».
**15.55** Культурныя людзі.
**16.25** Рамантычная камедыя «Змёрзлая з Маямі» (ЗША).
**18.20** «OFF STAGE LIFE».
**18.35** «Арэна».
**19.00** Навіны.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Бяссонная ноч». Канцэрт Вітаса.
**21.00** Панарама.
**21.40** 82-я цырымонія ўручэння прэміі «Оскар».
**23.25** «J:Морс». Канцэрт у тэатры.
**00.20** Хакей для ўсіх.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Фільм «Самая абаяльная і прывабная».
**10.35** Прэм'ера. Бенефіс Ларысы Галубкінай.
**12.05** Фільм «Службовы раман».
**14.55** АНТ прадстаўляе: Футбол. Суперкубак Беларусі. БАТЭ - Нафтан. Прамая трансляцыя (у перапынку «Нашы навіны»).
**17.05** «Сэкс - сімвалы. Расійскія зоркі. Жанчыны».
**17.55** Прэм'ера. Канцэрт Патрысіі Каас.
**19.25** Прэм'ера АНТ: «Давай ажэнімся!».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Здабыткі Рэспублікі». Святочны выпуск.
**00.05** Рамантычная драма «Эскорт для дам».

**06.30** Мультыплікацыйны фільм.
**07.00** «Званая вячэра».
**07.50** «Вялікі горад».
**08.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.10** Прэм'ера! «Цуд». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Званая вячэра».
**17.40** «Зорны рынг». Святочны выпуск.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Эма». ЗША-Вялікабрытанія, 1996 г.
**22.35** СТБ прадстаўляе: «Вясна ў вялікім горадзе». Святочны канцэрт.
**23.50** Фільм «Тры напаўграцыі». Расія, 2006 г.
**01.50** «Сталічны футбол».

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Музычная камедыя «Набожная Марта» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**10.25** Камедыя становішчаў «Блізнюк» (Францыя).
**12.30** «Танец. Учора, сёння, заўтра». Дакументальны фільм (Беларускае тэлебачанне).
**13.30** Меладрама «Жанчыны» (СССР).
**15.25** Тэлебарометр.
**15.40** Прэм'ера. Авантурна-рамантычная камедыя «Варажэя» (Украіна). 1-4-я, заключная, серыі.
**19.10** Прэм'ера. Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**20.10** Калыханка.
**20.25** Смешная часіна.
**21.10** Дэтэктыўная камедыя «8 жанчын» (Францыя - Італія).
**23.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.

РОССИЯ

**07.00** Фільм «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі».
**09.20** Фільм «Мядовы месяц».
**11.00** «Ранішняя пошта».
**11.35** Фільм «8 сакавіка».
**13.20** Камедыя «Беражыце жанчын».
**14.00** Весткі.
**14.20** Камедыя «Беражыце жанчын». Працяг.
**16.15** Прэм'ера. «Усе песні для каханай».
**17.00** Весткі.
**17.10** Прэм'ера. «Усе песні для каханай». Працяг.
**18.40** Фільм «Не магу сказаць «бывай».
**20.30** Прэм'ера. «Бабы, наперад!». Святочная праграма.
**23.25** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**23.40** Рамантычная камедыя «Вялікае каханне».
**01.15** Заканчэнне эфіру.

НТВ

**06.55** Музычная камедыя «Марыца».
**08.00** Сёння.
**08.20** «І зноў добры дзень!».
**09.10** Прэм'ера. Камедыйны серыял «Ажаніць Казанову».
**10.00** Сёння.
**10.20** Серыял «Ажаніць Казанову». Працяг.
**13.00** Сёння.
**13.25** Серыял «Ажаніць Казанову». Працяг.
**16.00** Сёння.
**16.15** Серыял «Ажаніць Казанову». Працяг.
**17.10** Меладрама «Бамжыха».
**19.00** Сёння.
**19.25** Прэм'ера. Меладрама «Бамжыха-2».
**21.20** Прэм'ера «8 Сакавіка з Ірынай Алегравай».
**23.20** Прэм'ера «Міс Расіі-2010».

EUROSPORT

**09.30** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**09.35** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» у Бразіліі (Курытыба). 2-я гонка.
**10.30** Матаспорт па выхадных.
**10.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). HS 130.
**11.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Эстоніі (Отэпяа). Жанчыны. 4х5 км класічным і вольным стылямі.
**12.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Эстоніі (Отэпяа). Мужчыны. 4х10 км класічным і вольным стылямі.
**13.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). HS 130.
**14.30** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы ў Эстоніі (Отэпяа). Мужчыны. Гонка пераследу.
**15.00** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы ў Эстоніі (Отэпяа). Жанчыны. Гонка пераследу.
**15.30** Веласпорт. Велагонка Парыж-Ніца. Пралог. Францыя.
**16.15** Веласпорт. Велагонка Парыж-Ніца (Францыя). 1-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Лахці). HS 130.
**19.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куопіо). HS 127. Кваліфікацыя. Прамая трансляцыя.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**20.45** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**21.45** Футбол. Кубак свету-2010. Часопіс.
**22.20** Вось дык так!!!
**22.30** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**23.00** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**00.00** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**01.00** Футбол. Кубак свету-2010. Часопіс.
**01.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куопіо). HS 127. Кваліфікацыя.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.30** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.30** Госць «Белсату».
**18.50** Беспрацоўныя, дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**19.15** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.50** Героі не нашага часу: Уладзімір Парфяновіч – звычка перамагаць.
**20.05** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.20** «Лідэркі», рэпартаж, 2009 г.
**20.40** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Фільматэка майстроў: «Перапісанае жыццё», маст. фільм, 2006 г., ЗША.
**23.10** Аб'ектыў.

## 9 САКАВІКА, АЎТОРАК

1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Арэна.
**09.05** Дэтэктыўны серыял «Ліквідацыя».
**10.00** Рамантычная камедыя «Змёрзлая з Маямі» (ЗША).
**11.40** Адмысловы рэпартаж АТН «Жывыя легенды рамёстваў».
**12.10** Камедыя «Ідэальная жонка» (Расія).
**14.05** У свеце матораў.
**14.30** Nota Bene.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Здароўе.
**15.55** Сямейная сага «Ярмолавы» (Расія).
**16.50** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Ліквідацыя».
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**23.40** «OFF STAGE LIFE».
**00.05** Дзень спорту.
**00.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**09.50** АНТ прадстаўляе: «Цудоўная пяцёрка».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Прэм'ера. Камедыйны серыял «Мая выдатная няня». Пасля вяселля, 2008 год.
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**22.05** Прэм'ера. «Спроба Веры». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Зваротны адлік».
**00.00** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.45** Нашы навіны.
**01.00** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Эма». ЗША-Вялікабрытанія, 1996 г.
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Былая». Серыял.
**13.50** «Крокі да поспеху».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Top Gear. Руская версія».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.55** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**22.00** «Пяць гісторый».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Надзвычайныя гісторыі».
**23.50** «Інструктар». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.35** У гэты дзень.
**09.40** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**11.30** «Запал па культуры».
**12.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**13.05** Кінаспробы.
**13.30** Мультсерыял «Галактычны футбол» (Францыя).
**14.20** Пазакласная гадзіна.
**14.40** Свая кампанія.
**15.15** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія-Швейцарыя).
**16.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**19.50** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**20.35** Калыханка.
**20.50** Беларуская часіна.
**21.55** Спорт-кадр.
**22.25** Гістарычная драма «Бег» (СССР). 1-я серыя.
**00.00** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія-Швейцарыя).

РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Круты маршрут Ігара Крутога». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**11.40** Тэлесерыял «Чэрчыль». Расія , 2009 г.
**13.20** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** Прэм'ера. «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял. Расія , 2009 г.
**15.15** Тэлесерыял «Вакзал».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.45** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія , 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**20.30** Тэлесерыял «Чэрчыль». Расія , 2009 г.
**22.20** Тэлесерыял «Дворык».
**22.55** Прэм'ера. «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял. Расія , 2009 г.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** Прэм'ера. «Жаночы дзень». Дакументальны фільм.

НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**08.55** «Асабліва небяспечны!».
**09.20** «Іх норавы».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Кулінарны паядынак».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР-2».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».
**15.05** «Сярэдні клас».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Вострасюжэтны серыял «Ганчакі: гонка за лідэрам».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**21.30** Дэтэктыўны серыял «Турма адмысловага прызначэння».
**23.15** Сёння.
**23.40** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў. Фіярэнціна (Італія) - Бавария (Германія).

EUROSPORT

**09.30** «Алімпійскія гульні». Часопіс.
**10.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Эстоніі (Отэпяа). Мужчыны. 4х10 км класічным і вольным стылямі.
**10.45** Біятлон. Чэмпіянат Еўропы ў Эстоніі (Отэпяа). Мужчыны. Гонка пераследу.
**11.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куопіо). HS 127. Кваліфікацыя.
**12.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**13.15** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**14.15** Футбол. Кубак свету-2010. Часопіс.
**14.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куопіо). HS 127. Кваліфікацыя.
**15.45** Веласпорт. Велагонка Парыж-Ніца (Францыя). 1-ы этап.
**16.15** Веласпорт. Велагонка Парыж-Ніца (Францыя). 2-і этап. Прамая трансляцыя.
**18.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куопіо). HS 127. Прамая трансляцыя.
**19.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.55** Футбол. «Клуб чэмпіёнаў». Часопіс.
**20.55** Футбол. Кубак свету-2010. Часопіс.
**21.25** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBA у Канадзе.
**22.00** Бокс.
**00.00** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit (Шамані, Францыя).
**00.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**01.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куопіо). HS 127.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Праект «Будучыня».
**17.35** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ягайла» (спазнавачая праграма).
**17.45** Дакументальная гадзіна: «Вароніна возера», дак. фільм, 2007 г., Літва.
**18.50** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**19.20** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.25** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.45** Беларусы ў Польшчы.
**20.00** Акно ў Еўропу.
**20.25** «Прывід з Давыд-Гарадка», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**20.40** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**22.15** Форум (ток-шоу): «Уласнасць як аснова дэмакратыі».
**22.55** Аб'ектыў.

## 12 САКАВІКА, ПЯТНІЦА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05** Камедыйны серыял «Сваты» (Украіна). 1-я серыя.
**09.55** Дак. цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Камедыя «Агенцтва «Мара» (Расія - Украіна).
**13.45** «OFF STAGE LIFE».
**14.05** Шпілька.
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Bravissimo, Андрэй! Адлюстраванне зніклага часу».
**15.55** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**18.05** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйны серыял «Сваты» (Украіна). 2-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Драматычны серыял «Доктар Хаўс. Чацвёрты сезон» (ЗША).
**23.00** Фантастычны серыял «Героі-3» (ЗША).
**00.00** Дзень спорту.

### ОНТ

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?».
**22.25** Прэм'ера. «Розыгрыш».
**00.00** Наша «Раша».
**00.30** Фільм «Дзень Д».
**02.00** Нашы навіны.
**02.15** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Інструктар». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Былая». Серыял.
**13.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Салдаты. Дзембель непазбежны!». Серыял.
**16.50** «Асабісты інтэрас».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Паўтары рыцары: ў пошуках выкрадзенай прынцэсы Херцэлінды». Германія, 2008 г.
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.10** Фільм «Рой». Канада, 2005 г.
**01.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Час футболу.
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Жансавет.
**10.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**11.05** Прыгодніцкі фільм «Здабытак рэспублікі» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**13.25** Дакументальна-пазнавальны фільм «Лён - еўрапейскае перакрыжаванне».
**14.15** Мультсерыял «Галактычны футбол».
**14.40** Свая музыка. Працяг.
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Змяшаная эстафета. Прамая трансляцыя.
**16.40** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Пра мастацтва.
**19.30** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**20.20** Калыханка.
**20.40** Бітва экстрасэнсаў.
**21.50** Тэлепорт.
**22.15** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Плэй-оф. Паўфінал 1-ы.
**00.10** Футбол. Ліга Еўропы. Агляд тура.
**01.05** Вольная барацьба. Гран-пры на прызы трохкратнага алімпійскага чэмпіёна А.Мядзведзя. Дзень 1-ы.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Чэрчыль». Расія , 2009 г.
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** Пакой смеху.
**15.15** Тэлесерыял «Служба даверу».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.45** Прэм'ера. «Кармэліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія , 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Фільм «Выбар маёй матулі». Расія, 2008 г.
**22.25** Навіны - Беларусь.
**22.35** Фільм «Вяртанне блуднага таты».
**00.25** Фільм «Праверка на дарогах».

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Асабліва небяспечны!».
**09.10** «Алтар Перамогі».
**10.00** Сёння.
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.15** «Галоўны герой прадстаўляе…».
**12.05** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР-3».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».
**15.05** «Сярэдні клас».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Вострасюжэтны серыял «Ганчакі: гонка за лідэрам».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц. Працяг».
**22.45** Дэтэктыўны трылер «Лютасць».
**00.30** Драма «Паварот лёсу».

### EUROSPORT

**09.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Мужчыны. Супергігант.
**10.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Мужчыны. Слалам-гігант. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**11.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Жанчыны. Слалам-гігант. 2-я спроба.
**11.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Жанчыны. Супергігант. Прамая трансляцыя.
**12.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Мужчыны. Слалам-гігант. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**13.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Нарвегіі (Драмен). Спрынт.
**14.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Лілехамер). HS 138. Кваліфікацыя.
**15.15** Біятлон. Кубак свету ў Фінляндыі (Конціалахці). Эстафета. Прамая трансляцыя.
**17.00** Веласпорт. Велагонка Парыж-Ніца (Францыя). 5-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Лілехамер). HS 138. Прамая трансляцыя.
**19.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.55** Веласпорт. Тур Цірэна-Адрыятыка (Італія). 3-і этап.
**21.00** Наймоцныя людзі планеты. Giants Live (Ставаангер, Нарвегія).
**22.00** Бокс. Прамая трансляцыя.
**00.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Лілехамер). HS 138.
**01.00** Экстрэмальны спорт.
**01.30** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit (Шамані, Францыя).
**02.00** Біятлон. Кубак свету ў Фінляндыі (Конціалахці). Змяшаная эстафета.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** На колах.
**17.30** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.15** Форум (ток-шоу): «Іншамаркі» і людзі».
**19.00** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Made in Ukraine».
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** Беларусы ў Польшчы.
**19.55** Невядомая Беларусь: «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, 2009 г., Польшча, ч. 1.
**20.35** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Разбітая шклянка», маст. фільм, 2003 г., ЗША.
**22.55** Аб'ектыў.

## 13 САКАВІКА, СУБОТА

### 1

**06.35** Прэм'ера. Дакументальна-пазнавальны серыял «Серферы» (Францыя). 1-я серыя.
**07.05** Існасць.
**07.30** Дзень спорту.
**07.40** Дзённік «Мінск - Вена -- 2010».
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.40** Дэтэктыўны серыял «Шпікі раённага маштабу-2» (Расія).
**10.30** Шпілька.
**11.05** Ранішняя хваля.
**11.45** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Іранічны дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан» (СССР). Фільм «Знаёмства».
**13.35** Дакументальны фільм «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан». Фільм «Знаёмства». «Невядомая версія» (Украіна).
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.15** Дакументальны цыкл «Фартыфікацыя» (Беларусь).
**16.55** Дзённік «Мінск - Вена -- 2010».
**17.10** Відэафільм АТН «Подых чашніцкай зямлі» цыклу «Зямля беларуская».
**17.25** Відэафільм АТН «Вольга Смаляк» цыклу «Лёгка сказаць».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.00** Навіны.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Зорныя танцы. Мужчынскі сезон. Перадача 5-я.
**21.00** Панарама.
**21.40** Прэм'ера. Гістарычная драма «Цар» (Расія).
**00.00** Уласнай персонай.

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** Асяроддзе пасялення.
**12.15** АНТ прадстаўляе: Тэлечасопіс «Звяз».
**12.45** «Кінаметры вайны».
**13.15** Мастацкія фільм «Полымя».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Мой радавод».
**17.15** Камедыя «Формула кахання».
**18.55** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**19.55** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне». Беларусь.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Цудоўная пяцёрка».
**22.15** «Пражэктарпэрысхілтан».
**22.45** Прэм'ера. Фільм «Аднойчы ў правінцыі».

### СТВ

**07.05** «Анфас».
**07.20** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**08.10** Фільм «Вясновая казка». СССР, 1971 г.
**09.30** «Культурнае жыццё».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.45** «Фантастычныя гісторыі».
**14.30** Фільм «Супрацьстаянне». СССР, 1985 г.
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.45** Фільм «Дараваная нядзеля». Украіна, 2007 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.25** Фільм «P.S. Я кахаю цябе».ЗША, 2007 г.
**23.45** Фільм «Мост караля Людовіка Святога «. Францыя- Вялікабрытанія - Іспанія, 2004 г.
**01.45** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**06.40** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**07.05** Усё аб бяспецы.
**07.35** Тэлепорт.
**08.00** Нашы тэсты.
**08.30** Прыгодніцкі вестэрн «Следапыт» (СССР).
**10.05** Жансавет.
**10.45** Свая кампанія.
**11.25** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**12.55** Лабірынты: свята ад Вільні.
**13.25** «Запал па культуры».
**14.05** Прэм'ера. Дакументальна-пазнавальны фільм «Корсіка. Выспа прыгажосці» (Францыя).
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**16.35** Пасоўванне+.
**16.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Чэлсі - Вэст Хэм. Прамая трансляцыя.
**19.00** «Зоркі гумару». Гумарыстычная праграма (Расія).
**19.45** Трагікамедыя «Коля - перакаці поле» (Расія).
**21.40** Жывы гук.
**22.20** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Плэй-оф. Паўфінал 2-і.
**00.15** Казанова.
**00.45** Вольная барацьба. Гран-пры на прызы трохкратнага алімпійскага чэмпіёна А.Мядзведзя. Дзень 2-і.

### РОССИЯ

**07.00** Весткі.
**07.15** Фільм «На чужым свяце».
**08.40** Фільм «Вяртанне блуднага таты».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** «Хто ў хаце гаспадар».
**12.20** Фільм «Выбар маёй матулі». Расія , 2008 г.
**14.00** Весткі.
**14.15** «Пакой смеху».
**15.20** Фільм «Аб бедным гусары замоўце слова». 1-я серыя.
**17.00** «Суботні вечар».
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.45** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**20.20** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2010.
**23.00** Фільм «Смерць па завяшчанні».
**00.35** Фільм «Адзіная».
**02.05** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.05** Драма «Паварот лёсу».
**07.35** «Казкі Бажэнава».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Прафесія-рэпарцёр».
**08.50** «Агляд».
**09.20** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Жаночы погляд».
**14.10** Прыгодніцкі фільм «Мост у Тэрабіцію».
**16.00** Сёння.
**16.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**17.20** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.05** «Праграма Максімум».
**21.15** «Руская сенсацыі».
**22.10** «Ты не паверыш!».
**23.10** Прэм'ера. Трылер «Незнаёмцы».
**00.40** Прэм'ера. Камедыя «Антысэкс».

### EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Мужчыны. Слалам. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**10.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Жанчыны. Слалам. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**11.30** Біятлон. Кубак свету ў Фінляндыі (Конціалахці). Жанчыны. Спрынт. Прамая трансляцыя.
**13.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Мужчыны. Слалам. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**13.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Жанчыны. Слалам. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**14.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Нарвегіі (Осла). Жанчыны. 30 км вольным стылем.
**15.15** Біятлон. Кубак свету ў Фінляндыі (Конціалахці). Мужчыны. Спрынт. Прамая трансляцыя.
**16.45** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Нарвегіі (Осла). Гонка па сістэме Гундэрсена. Прамая трансляцыя.
**17.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Нарвегіі (Осла). Мужчыны. 50 км вольным стылем.
**18.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Осла). Кваліфікацыя. HS 128.
**19.10** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**19.15** Веласпорт. Велагонка Парыж-Ніца (Францыя). 6-ы этап.
**20.00** Веласпорт. Тур Цірэна-Адрыятыка (Італія). 4-ы этап.
**20.30** Біятлон. Кубак свету ў Фінляндыі (Конціалахці). Жанчыны. Спрынт.
**21.30** Горныя лыжы. Хуткасны спуск. Зімовыя Паралімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**23.00** Біятлон. Мужчыны і жанчыны. Гонка пераследу. Зімовыя Паралімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**00.00** Тэніс. Турнір WTA у ЗША (Індыян-Уэлс). Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.35** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.20** Чалавек і вайна: «Бронзавы жаўнер Алёша», дак. фільм, 2008 г., Эстонія.
**19.30** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.35** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.45** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.00** «Свята на нашай вуліцы», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**20.25** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.10** Суботні сеанс: «Рыцары неба», маст. фільм, 2005 г., Францыя.

## 14 САКАВІКА, НЯДЗЕЛЯ

**07.40** Дзіцячая музычная камедыя «Новыя прыгоды капітана Врунгеля» (СССР).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** Альманах вандраванняў.
**10.15** Культурныя людзі.
**10.55** У свеце матораў.
**11.25** Nota Bene.
**12.10** Іранічны дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан» (СССР). Фільм «Крывавы надпіс».
**13.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**14.00** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**14.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**16.10** Сямейная камедыя «Рудзі - гончае парася» (Германія).
**18.00** Суперлато.
**19.20** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.10** Тэлешоў «Victoria's secret» (ЗША).
**23.05** Драма «Спадарожніца» (Італія).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Прэм'ера «Шчасце ёсць!».
**12.00** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.35** «Разумніцы і разумнікі».
**13.20** Нядзельны «Ералаш».
**13.45** «Песні Перамогі»..
**14.15** Фільм «Чалавек-амфібія».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Тэорыя верагоднасці.
**16.55** Прэм'ера. «Каму на Русі жыць добра?!» Канцэрт М.Задорнава.
**18.55** Прэм'ера АНТ: «Давай ажэнімся!».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** «Вялікая розніца».
**22.45** Фільм «Арэлі».
**00.25-01.20** «Паўднёвае Бутава».

**06.50** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**07.40** Фільм «Паўтары рыцары: ў пошуках выкрадзенай прынцэсы Херцэлінды». Германія, 2008 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.45** «Дарагая перадача».
**14.10** Фільм «Супрацьстаянне». СССР, 1985 г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Прызнанні небяспечнага чалавека «.ЗША-Канада-Германія, 2002 г.
**22.40** СТБ прадстаўляе: канцэрт групы «Крама».
**00.20** Фільм «Клас». Францыя, 2008 г.
**02.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.00** Дабравест.
**07.25** Мір вашай хаце.
**07.35** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.00** Сямейная камедыя «Грай для мяне» (ЗША).
**09.35** Школа рамонту.
**10.40** Медычныя таямніцы.
**11.25** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**12.10** Кінаспробы.
**12.30** Бухта капітанаў.
**13.10** «Правы чалавека».
**13.25** Гаспадар.
**13.55** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**14.40** Дакументальна-пазнавальны фільм «Сейшэлы - жамчужына Індыйскага акіяну» (Францыя).
**15.45** Драма «Восеньскія кветкі» (Украіна). 1 - 4-я, заключная, серыі.
**19.25** Нашы тэсты.
**19.55** Экспедыцыя.
**20.30** Тэлебарометр.
**20.50** Смешная часіна.
**21.20** Крымінальны трылер «Паварот» (Францыя - ЗША).
**23.40** Свая музыка. Працяг.

### РОССИЯ

**07.00** «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
**07.30** Фільм «Адзіная».
**09.15** Фільм «Смерць па завяшчанні».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Фільм «Чакайце лістоў».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.50** «Аляксандр Парахаўшчыкоў». Дакументальны фільм.
**15.35** Фільм «Аб бедным гусары замоўце слова». 2-я серыя.
**17.05** Прэм'ера. «Аншлаг і Кампанія».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Сумленны дэтэктыў».
**20.40** Прэм'ера. Юбілейны канцэрт Юрыя Антонава «Я не шкадую ні пра што».
**22.45** «Адмысловы карэспандэнт».
**23.50** Прэм'ера. Юбілейны канцэрт Юрыя Антонава «Я не шкадую ні пра што». Працяг.
**01.00** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.10** Прыгодніцкі фільм «Мост у Тэрабіцію».
**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Асабліва небяспечны!».
**11.25** «Першая кроў».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. Праект «У пошуках Францыі» «Апошняя вячэра ў Парыжы».
**14.10** Фантастычны баявік «І грымнуў гром».
**16.00** Сёння.
**16.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Брудная праца».
**00.05** «Авіятары».
**00.35** «Футбольная ноч».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Суперкубак Паршэ (Сахір, Бахрэйн). 1-я гонка.
**10.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Осла). Кваліфікацыя. HS 128.
**10.30** Біятлон. Кубак свету ў Фінляндыі (Конціалахці). Жанчыны. Спрынт.
**11.30** Біятлон. Кубак свету ў Фінляндыі (Конціалахці). Жанчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**12.15** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Нарвегіі (Осла). HS 130.
**12.30** Аўтаспорт. Суперкубак Паршэ (Сахір, Бахрэйн). 2-я гонка. Прамая трансляцыя.
**13.15** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Нарвегіі (Осла). Гонка па сістэме Гундэрсена. Прамая трансляцыя.
**13.45** Біятлон. Кубак свету ў Фінляндыі (Концiалахці). Мужчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**14.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Осла). HS 128. Прамая трансляцыя.
**16.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Нарвегіі (Осла). Спрынт. Прамая трансляцыя.
**17.55** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**18.00** Веласпорт. Велагонка Парыж-Ніца (Францыя). 7-ы этап.
**18.45** Веласпорт. Тур Цірэна-Адрыятыка (Італія). 5-ы этап.
**19.15** Лыжныя гонкі. Зімовыя Паралімпійскія гульні (Ванкувер, Канада).
**20.30** Горныя лыжы. Супергігант. Зімовыя Паралімпійскія гульні (Ванкувер, Канада). Прамая трансляцыя.
**22.30** Тэніс. Турнір WTA у ЗША (Індыян-Уэлс). Дзень 5-ы.
**00.00** Тэніс. Турнір WTA у ЗША (Індыян-Уэлс). Дзень 5-ы. Прамая трансляцыя.
**01.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Осла). HS 128.
**02.30** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.20** Дакументальная гадзіна: «Рэвалюцыянеры», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**19.15** «Бульбаны», мультсерыял.
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** МакраФон: «Новая традыцыя», канцэрт Доны Розы.
**20.30** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**21.00** Тыдзень «Аб'ектыве».
**21.30** Фільматэка майстроў: «За жменю даляраў», маст. фільм, 1964 г., Італія.

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012211080010 фил. МГД ОАО «Белинвестбанк», код 153001764, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______________
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______________

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у аддзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ________

Кассир Всего ________

ЦІКАВА

# ТАПАНІМІЧНАЯ ВАЙНА

Алег ПЯТРОЎ

**У Казахстане разгараецца вайна вакол таго, як павінны называцца гарады, імёны якіх звязаныя з часамі Расійскай імперыі.**



Casus Belli стаў фрагмент прэсканферэнцыі ў прамым эфіры, якую нядаўна даў Назарбаеў. Пытанні па тэлефоне задавалі грамадзяне. І вось у студыю прыйшло чарговае тэлефанаванне. На праводзе быў адзін з жыхароў Уральску, які папрасіў гаранта надаць яго гораду новую казахскую назву. Тым больш, што назва «Уральск» звязана з часамі каланізацыі краю. Назарбаеў адрэагаваў на прапанову туманнай рэмаркай. Сказаў нешта накшталт таго, што канчатковае рашэнне за самімі жыхарамі Уральску.

Тут усё і пачалося. Дыму без агню не бывае, вырашыла большасць жыхароў Уральску, дзе, дарэчы, пераважаюць рускамоўныя. Бо ўсім даўно зразумела, як арганізуюцца падобныя прэсканферэнцыі. Пытанні на іх, як правіла, рыхтуюцца загадзя, каб раптам хто не паставіў сваім тэлефанаваннем прэзідэнта ў няёмкае становішча. Няўжо ўлады сапраўды зандзіруюць глебу для рэформы? Тым больш, што ў 2005 годзе пытанне перайменавання ўжо ўздымалася на ўзроўні абласнога выканкама.

У любым выпадку, эпізод з тэлефанаваннем Назарбаеву нарабіў розгаласу ў горадзе. Па руках абывацеляў хадзіў нібыта скрадзены з кампутараў гарадской адміністрацыі ліст з варыянтамі новых назваў Уральску: Арал, Жайык, Акжайык і Жанібек. Пенсіянеркі і іншыя аматары чутак аўтарытэтна сцвярджалі, што лепшыя шансы мае Жайык. Менавіта так называецца гарадзішча, якое раскапалі археолагі нядаўна недалёка ад горада. Каментуючы вынікі даследаванняў, гісторыкі тады заявілі: гістарычна цяперашні Уральск спачатку месціўся на гэтым гарадзішчы. У 1613 годзе казакі, якіх царскія ўлады выкарыстоўвалі ў якасці авангарду каланізацыі, знішчылі тубыльскі цэнтр і заснавалі побач свой горад. У выніку адна з мясцовых краязнаўчых ініцыятыў звярнулася да прэзідэнта Назарбаева з лістом, дзе прасіла кіраўніка краіны не пакінуць гэты факт без увагі. Адначасова пачаўся збор подпісаў за захаванне старой назвы.

Улады мусілі рэагаваць. Адзін з бацькоў горада праінфармаваў грамадскасць пра тое, што яму нічога не вядома пра Арал, Жайык, Акжайык і Жанібек як альтэрнатыўныя назвы для Уральску.

Навіну бакі канфлікту і медыя пракаментавалі вельмі арыгінальна. Праўладныя СМІ пішуць пра мудрасць Назарбаева, які не дапусціў развіцця міжнацыянальнага канфлікту. Апазіцыйныя — пра перамогу грамадзянскай супольнасці над назарбаеўскай аўтакратыяй. Быццам улады не рызыкнулі цягацца з уральцамі, гатовымі жыццё пакласці за старую назву горада.

Сітуацыя яшчэ больш заблыталася пасля таго, як казахскія нацыяналісты абвінавацілі вядомага ва Уральску рускага патрыёта ў тым што менавіта ён тэлефанаваў тады прэзідэнту і прасіў пра перайменаванне. Быццам за кошт званку той хацеў справакаваць рускамоўную грамаду Уральска і Казахстана на пратэсты супраць казахізацыі. Сам патрыёт сцвярджае, што абвінавачанні супраць яго — гэта справы ягоных ворагаў, тых самых казахскіх нацы.

Не абышлося без жартаў. На форумах можна сустрэць такі пасаж: «Прапаную таксама перайменаваць Казахстан. Занадта неактуальная назва. Лепш будзе гучаць — Нурсултан». Нехта заклікае гарадскія ўлады Уральска не выстаўляць сябе на смех: «Як жа будзе цяпер называцца мясцовы конкурс прыгажунь.«Міс Арал»?»

Аднак скандал не закончыўся нават пасля таго, як улады, здаваліся, супакоілі ўральцаў. Цяпер ён перайшоў у іншую, глабальную плоскасць. Бакі актыўна спрачаюцца, наколькі мэтазгодна казахскім уладам далей працягваць палітыку карэкцыі старой тапанімікі. Раней, нагадаем, пачалі гучаць на казахскі лад гарады Акцюбінск (цяперашні Акцюбе), Алма-Ата (сёння Алма-Аты), Гур'еў (новая назва Атырау). Горад Омск, які ў ХІХ стагоддзі быў сталіцай так званага Сцяпнога генерал-губернатарства, у склад якога ўваходзіў Паўночны Казахстан і дзе фактычна канцэнтравалася ўся тагачасная казахская эліта, некаторыя называюць таксама па-казахску Омбе.

Негістарычнасць назваў, кшталту Арал, Жайык г.д., і нацыяналістычны характар патрабаванняў перайменавання не выклікае сумневаў. Можна прачытаць на некаторых казахскіх інтэрнэт-рэсурсах спрэчную легенду пра паходжанне назвы Жайык. Маўляў, пасля далучэння казахскіх земляў да Расіі Кацярына ІІ правяла нараду наконт геаграфічных назваў на захопленых землях: «Як называецца гэта рака па-казахску?» — спытала яна ў аднаго з прыдворных. «Жайык, што ў перакладзе на рускую мову значыць Урал», — адказаў той. «Загадваю называць раку Урал і заснаваць тут горад Уральск», — пастанавіла Яе Імператарская Вялікасць. Аднак першапачаткова рака Урал называлася Яік, а Уральск, адпаведна, Яіцкі Гарадок.

Таксама ідэя адміністрацыйнага навязвання новай тапанімікі супярэчыць прынцыпу "не ставіцца да гісторыі з пункту гледжання палітычнай кан'юктуры». Адзін з блогераў заўважае: «Гэта дурасць — праводзіць казахізацыю ўсяго і ўся. У Расіі, напрыклад, шмат гарадоў з нярускімі назвамі: Санкт-Пецярбург, Арэнбург (нямецкія назвы), аднак ніхто іх не перайманоўвае, таму што гэта гісторыя, ёсць і гарады з цюркскімі назвамі: Астрахань, Саратаў».

Аднак аргументы апанентаў таксама заслугоўваюць увагі. Ці магчыма будаўніцтва паўнавартаснай нацыі казахаў, калі назвы на карце Казахстана ўказваюць, хто тут быў гаспадаром? Тыя ж Паўладар і Петрапаўлаўск названыя ў гонар рускіх цароў. «Дайшлі да ручкі. Казахі на сваёй зямлі нават не могуць назву вуліц змяніць», — піша адзін са свядомых казахаў.




## КАМЕНТАР

**Андрэй Грышын, журналіст з Алма-Аты:**

— Палеміка вакол перайменавання Уральску — гэта па-сутнасці прыклад правядзення ўладамі так званай палітыкі «міжнацыянальнай згоды». Дэ-факта ўлада з самага пачатку праводзіла і праводзіць курс на распальванне шавіністычных настрояў за кошт моўнай або кадравай палітыкі. Калі нацыяналісты (рускія або казахскія) занадта гучна дамагаюцца дэ-факта перавесці ў дэ-юрэ, улада дае зваротны ход. У такім выпадку знікне адна з самых галоўных падстаў легітымнасці Назарбаева, які выстаўляе сябе як адзіны гарант міжнацыянальнай згоды і роўнасці этнасаў Казахстана.




## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Трэба сказаць, што Беларусь не можа ганарыцца візітамі зорак сусветнай велічыні: не было тут ні канцэртаў Мадонны, ні шоу «Depeche Mode». Людзі, якія займаюцца арганізацыяй канцэртаў у Беларусі з удзелам замежных зорак, на правах ананімнасці кажуць: «Гэта дзікунства. Краіна зачыняецца ад усяго свету не толькі палітычна, але і культурна. Гэты выпадак будзе паказальным: калі раптам забароняць «Rammstein», ніхто сюды ніякіх добрых артыстаў наогул прывозіць ніколі не будзе». Аднак тут важна разумець, што ў дадзеным выпадку арганізатарам выступае Палац Рэспублікі — дзяржаўная структура. Таму застаюцца нейкія надзеі на тое, што канцэрт усё ж адбудзецца. Калі б арганізатарам была прыватная кампанія, ніякіх шансаў пабачыць «Rammstein» у Мінску не было б. Такім чынам, Беларусь паступова дае зразумець, што адпачынак — гэта калі масава адзначаецца дзяржаўнае свята, наяўнасць якога спалучаецца з магутным ідэалагічным складнікам. Калі гэтага няма, то і адпачываць няма чаго. Лепш працаваць. Прэзідэнт, зрэшты, неаднаразова казаў, што ён чалавек працавіты і ад іншых таго ж чакае.

**«Коррепондент» (Украіна)**

Напэўна, у Януковіча можа быць галоўным і сур'ёзным партнёрам Беларусь. Таму, здаецца, лагічна чакаць нейкага руху на ўкраінска-беларускім накірунку, новых формаў кааперацыі, якія не былі задзейнічаны ў папярэдні перыяд, хоць цікавасць да іх была. Зразумела, што Юшчанка і Лукашэнка, хоць і сустракаліся часам, падкрэслівалі ўзаемныя інтарэсы, але яны былі дрэнна сумяшчальнымі прэзідэнтамі і ідэалагічна, і псіхалагічна. Цяпер гэты накірунак важны, і, напэўна, Маскве трэба было б задумацца пра тое, як ператварыць (наколькі гэта магчыма) гэты тандэм у трохкутнік. Сэнс не ў тым, каб не дапусціць рэнесансу ўкраінска-беларускіх адносін, а каб паўдзельнічаць у ім. Зрабіць гэта, аднак, будзе не проста.

**АПН (Расія)**

Старэйшы сын беларускага прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, Віктар, практычна цалкам «вынішчыў» Галоўнае ўпраўленне МУС Беларусі па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі. Якраз яно апошнія гады распачынала крымінальныя справы супраць шматлікіх высокапастаўленых службоўцаў з асяроддзя беларускага прэзідэнта. Вайна, якую КДБ вёў супраць МУС, завяршылася ў канцы лютага. Былі знішчаны адразу тры структуры, якія складалі касцяк палітычнага вышуку ў краіне: Упраўленне па абароне дзяржаўнага ладу і грамадскай бяспецы ў Генеральнай пракуратуры, Упраўленне па барацьбе з карупцыяй, а таксама Дзяржаўны цэнтр бяспекі інфармацыі. Замест іх стварылі Аператыўна-аналітычны цэнтр пры прэзідэнце. Гэта новая спецслужба, якая цалкам падпарадкоўваецца сыну прэзідэнта Беларусі.

**«Огонек» (Расія)**

Каментуючы сітуацыю (рост у Беларусі коштаў на транспарт і бензін), мясцовыя эканамічныя эксперты кажуць не столькі пра «фактар» Расіі, якая паменшыла прыбыткі НПЗ, колькі пра правал нацыянальнай эканамічнай палітыкі, якая рабіла стаўку на тыя рэсурсы, якімі сама не валодае. Фактычна пачынаюць рэалізоўвацца прагнозы незалежных экспертаў пра тое, што пазбаўленне расійскіх энергетычных датацый прывядзе да краху беларускую эканоміку, якая захавала структуру савецкага перыяду. На жаль, даводзіцца канстатаваць, што ўрад Беларусі пакуль не зрабіў правільных высноў з папярэдніх памылак. Напрыканцы мінулага тыдня беларуская дэлегацыя пад кіраўніцтвам віцэ-прэм'ера Андрэя Кабякова закаціла істэрыку на пасяджэнні камісіі Мытнага саюза з нагоды ўмоваў паставак нафты. Беларусь пагадзілася на Мытны саюз толькі з-за жадання атрымліваць і далей танныя энерганосьбіты, аднак менавіта гэта пытанне Расія мае намер вынесці за дужкі Саюза».

**«Независимая газета» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### КУБА. ПАХАВАННЕ ПАЛІТЫЧНАГА ВЯЗНЯ

Ціха і без асаблівых эксцэсаў прайшло пахаванне Арланда Сапата Тамайя, вязня-дысідэнта, які памер на 86-м дні галадоўкі пратэсту супраць умоў утрымання ў турме. Наўрад ці магло быць па-іншаму: па-першае, горад, дзе Арланда праводзілі ў апошні шлях, знаходзіцца на адлегласці 830 кіламетраў ад Гаваны. Па-другое, усе падыходы да горада падчас пахавання перакрыла паліцыя. Перш за ўсё, яна здымала з транспарту дэмакратаў, якія спрабавалі прыняць удзел у пахавальнай цырымоніі. Не пусцілі таксама шмат сваякоў нябожчыка. Аднак нават такі сціплы фармат пахавання не збіў хвалю гневу ў сусветных СМІ. Шмат з іх звярталі ўвагу, што раней Куба давала ААН гарантыі таго, што не будзе катаваць у турмах.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

### ФРАНЦЫЯ. КАМУ НАЛЕЖЫЦЬ ПРАВА НА НЯНАВІСЦЬ



Дзіўныя абвінавачанні адрасавалі правыя папулісты са швейцарскай Народнай партыі, здавалася б, сваім ідэйным саратнікам з французскага Нацыянальнага фронту. Жыхары альпійскай рэспублікі абвінавацілі французаў у тым, што апошнія скралі ў іх ідэю плаката, які быў выкарыстана народнікамі падчас кампаніі за забарону будаўніцтва мінарэтаў. На швейцарскім плакаце жанчына ў традыцыйным ісламскім адзенні на фоне мінарэтаў і швейцарскага сцяга з подпісам «Прыпыніць гэта!». У французскай версіі такая ж жанчына, тыя ж мінарэты на задніку. Толькі подпіс іншы — «Не ісламізацыі. Моладзь разам з Лё Пэнам». Замест сцяга Швейцарыі намалявана карта Францыі, якая пафарбавана ў колеры нацыянальнага сцягу Алжыра. Кіраўніцтва Народнай партыі кажа, што яны махнулі б рукой на плагіят, калі б Нацыянальны фронт быў выключна антыісламскай партыяй, аднак ён яшчэ і партыя антысемітаў. Менавіта гэта акалічнасць не падабаецца швейцарскім змагарам з мінарэтамі.

**Па матэрыялах «Le Monde» (Францыя)**

### ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. НАЦЫЯНАЛІЗМ НЕМАГЧЫМЫ БЕЗ ГЕЯЎ

У партыі прыхільнікаў незалежнасці Уэльсу Plaid Cymru створана фракцыя Plaid Pride. Заснавальнікамі фракцыі сталі сябры партыі, якія прытрымліваюцца нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі. Прэс-сакратар новага фармавання адзначыў, што «барацьба за роўныя правы грамадзян, у тым ліку гомасексуалістаў і лесбіянак — складовая уэльскага нацыяналізму». Прысутная на сходзе па стварэнню Plaid Pride дэпутатка уэльскага парламенту Бетан Джэнкінс дадала, што стварэнне «блакітнай» фракцыі дапаможа разбурыць міф пра тое, што Plaid Cymru — «партыя дрымучых сялян». «З дапамогай Plaid Pride партыя наладзіць кантакты з новымі сектарамі грамадства», — прагназуе дэпутатка. Plaid Cymru — галоўная партыя уэльскіх нацыяналістаў, створаная ў 1925 годзе. У рэгіянальным парламенце яна прадстаўленая другой па колькасці фракцыяй. Таксама тры дэпутаты прэзентуюць Plaid Cymru ў парламенце Вялікабрытаніі, адзін — у Еўрапарламенце.

**Па матэрыялах польскай прэсы**

### ЗША. СТВАРЫЛІ ПАРТЫЮ КАВЫ

Арыгінальна адрэагавалі амерыканскія лібералы на стварэнне Tea Party (Партыя гарбаты) у рамках рэспубліканскай. Назва Tea Party мае асаблівы падтэкст. Tea Party можна пракласці як гарбатная акцыя. Так назвалі амерыканскія патрыёты часоў барацьбы за незалежнасць краіны атаку на брытанскія караблі з грузам гарбаты ў заліве Бостана. Такім чынам амерыканцы пратэставалі супраць мытнай палітыкі Лондана. Бостанская Tea Party была знакам да пачатку антыбрытанскага паўстання. Праз трыста гадоў назва Tea Party зноў стала актуальнай. Аднак вядомая ў ЗША рэжысёр дакументальных фільмаў Анабэль Пак стварыла Coffee Party — Партыю кавы. Партыя будзе намагацца аб'яднаць, як гаворыцца ў яе маніфесце, усіх амерыканскіх патрыётаў у барацьбе супраць карпарацый і маніпуляцый (чытай, рэспубліканцаў).

**Па матэрыялах «The Washington Post» (ЗША)**

### ПАЛЕСЦІНА. БАЦЬКА АДРОКСЯ АД СЫНА

Шэйх Хасан Юсеф, адзін з лідэраў руху радыкальных ісламістаў «Хамас», адрокся ад сына. На інтэрнэт-сайце руху з'явіўся яго адкрыты ліст, у якім гаворыцца, што яго сын Мусаб больш яму не сын. Прычынай стаў пераход Мусаба ў хрысціянства. Акрамя таго, Мусаб дапамагаў ізраільскім спецслужбам сачыць за лідэрамі ісламістаў. Хасан Юсеф зараз знаходзіцца ў ізраільскай турме за арганізацыю тэракту. У сваім лісце шэйх адмаўляецца ад старэйшага сына, «якога калісьці звалі Мусаб». З гэтага часу, адпаведна ісламскім законам, усім чальцам сям'і Хасана забараняецца размаўляць з блудным сынам. Апошні таксама губляе правы атрымаць нешта ў спадчыну ад бацькі. Сам Мусаб, між тым, сёння жыве ў ЗША, дзе атрымаў палітычны прытулак. Ён займаецца тым, што піша кнігу пра тое, як быў шпіёнам.

**Па матэрыялах «Lewica» (Польшча)**

▸ З НАГОДЫ

# РЭАБІЛІТАВАЦЬ ДЫКТАТАРА

**Дачка славутага дыктатара Трухільё паспрабавала апраўдаць бацьку. І вось што з гэтага атрымалася. Рэпартаж са сталіцы Дамініканскай рэспублікі, Санта-Дамінга, журналіста «НЧ» Алега Новікава.**




Еўрапейцам, якія дэсантуюцца ў міжнародным аэрапорце «Las Americas», відавочна не па сабе. У Санта-Дамінга — плюс 30. Абліваючыся потам, скінуўшы ды прыхапіўшы пад руку курткі і футры, іншаземцы адразу пасля пашпартнага кантролю спяшацца ў цень пальмаў. Адсюль турысты глядзяць на абарыгенаў, для якіх спякота — нармальнае надвор'е. Больш таго, нават у такіх умовах можна займацца палітыкай.

Вечар 27 лютага. Сталічны гатэль Санта-Дамінга. Прыблізна а 20-й гадзіне на экране канферэнцзалы з'явілася немаладая арыстакратычнага выгляду жанчына. Анхеліна — дачка славутага мясцовага дыктатара Рафаэля Трухільё. Пасля забойства бацькі ў 1961 годзе яна збегла ў ЗША. Там жыве да гэтага часу на скрадзеныя і перапраўленыя ў свой час за мяжу грошы. Анхеліна напісала кнігу «Мой бацька Трухільё», якую цяпер хоча прэзентаваць дамініканскаму чытачу. Праўда, распавядаць пра свой твор яна збіраецца з дапамогай тэлевізійнага мосту Маямі — Санта-Дамінга. Гэта было вельмі слушнай ідэяй.

Не паспела жанчына і рот адкрыць, як у залу ўварвалася каманда, прыкладна сто чалавек. У якасці сродку для прарыву кардону ахоўнікаў яны выкарысталі плакаты з надпісамі «Трухільё — забойца», «Трухільё — казёл» (прыжыццёвая мянушка Трухільё ў колах апазіцыі). Гэта родзічы ахвяр рэжыму. Анхеліна, не чакаючы працягу скандалу, знікае з экрану манітора. Трансляцыя перарываецца.

Здавалася, падзея не вартая выеддзенага яйка. Трухільё належыць да кагорты самых вядомых і брутальных дыктатараў у гісторыі, на якіх няма дзе пячатку ставіць. За 30 гадоў праўлення ён паспеў накласці лапу на ўсе прыбыльныя сектары айчыннай эканомікі, знішчыў апазіцыю (самых заўзятых вывозілі ў горы і, прывязаўшы за ногі, скідвалі ўніз, пакуль тыя не станавіліся вар'ятамі), займаўся фальсіфікацыяй выбараў.

Акрамя таго, Рафаэль яўна хварэў на мегаламанію. На латках тутэйшых букіністаў я ўбачыў выпуск газеты «La Nation» за 1950-ы год. На першай старонцы артыкул пра прэзідэнта. Перш, чым пачаць апісанне таго, што зрабіў прэзідэнт, аўтар пералічвае ўсе яго тытулы: «Яго высокасць генералісімус, доктар, ганаровы прэзідэнт (так Трухільё называў сябе, калі на нейкі час фармальна перадаваў уладу адпаведнаму са сваіх родзічаў), патрыёт радзімы, бацька фінансавай незалежнасці, шэф войска».

Гэта не ўсё. Як я пазней даведаўся, усе карпарацыі і прафсаюзы ў абавязковым парадку прысвойвалі яму свае тытулы кшталту «Першы рабочы», «Першы журналіст» і нават «Першы кампазітар».

Памяць пра тыя жудасныя часы дасюль жыве ў народзе. Гаспадыня дому, дзе мне давялося прыпыніцца, узгадвае пра сваіх братоў-студэнтаў, звязаных з апазіцыяй. Аднойчы яны пайшлі на вучобу і не вярнуліся. Усе зразумелі, што з імі здарылася. Бацькі вырашылі перапраравіць дачку, якая была тады яшчэ школьніцай, у Еўропу. А пакуль рабілі візу, вачэй з яе не спускалі.

Таму такая рэакцыя на твор Анхеліны цалкам зразумелая. Тым больш, што яна не пакутуе на дэфіцыт фантазіі. Калі верыць дачцэ дыктатара, загады забіваць апазіцыянераў давалі лідэры апазіцыі, якія прабраліся ў дзяржаўныя органы. Такім чынам яны хацелі справакаваць выбух народнага пратэсту. Маўляў, некаторых сваіх апанентаў Трухільё сапраўды забіў, але гэта былі камуністы, саюзнікі Кастра, якія марылі пра Дамініканскую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку.

Смешна чытаць таксама пра тое, што бацька Анхеліны паспяхова змагаўся са злачыннасцю — ледзь не галоўнай праблемай сучаснага дамініканскага грамадства. Але на той момант у краіне папросту не існавала крыміналу, які быў бы часткаю міжнародных злачынных структур.

Аднак маштабы незадавальнення фаліянтам Анхеліны проста выходзяць за рамкі. Ужо больш за тыдзень толькі і размоў у прэсе і на тэлебачанні, што пра кнігу дачкі генералісімуса. У аўторак, 2 сакавіка, Федэрацыя патрыятычных арганізацый краіны нават заклікала да байкоту крамаў, на вітрынах якіх з'явіцца «Мой бацька Трухільё».

Асаблівасці сітуацыі ў краіне нам патлумачыў Ісус Лопес, выкладчык мясцовага тэхналагічнага інстытута, які асвоіў рускую мову ва універсітэце імя Патрыса Лумумбы ў Маскве ў 1970-я гады. Ён, здаецца, дасюль трымаецца вывучанага ў Маскве марксісцкага класавага падыходу да падзей у грамадстве.

Вось як Лопес тлумачыць матывы істэрыі вакол кнігі: «Нелюбоў да Трухільё — фірмовы знак нашай эліты і інтэлектуалаў. Трухільё выйшаў з народных нізоў і ставіўся да эліты вельмі варожа, як, дарэчы, і яна да яго. Менавіта эліта, як правіла, ставілася ахвярай ягоных забабонаў. Напрыклад, ён патрабаваў, каб арыстакраты прыводзілі яму сваіх дачок і жонак. Для простых сялян, каму было не да вялікай палітыкі, ён сапраўды нешта зрабіў. Была пабудаваная транспартная інфраструктура. Трухільё жорстка патрабаваў ад бацькоў, каб іхнія дзеці вучыліся ў школах. Пры Трухільё ў кожным муніцыпалітэце з'явіўся бясплатны шпіталь».

«Чаму ж тады масы не заступіліся за ягоны рэжым?» — пытаюся ў Ісуса.

«Народа Трухільё таксама баяўся. Давяраў выключна сваім родзічам. Таму не стварыў сістэмы, якая была б здольная рэпрадуктаваць сама сябе. Дастаткова было групе змоўнікаў забіць яго, як уся дзяржаўная вертыкаль рухнула», — кажа ён.

Няўжо народ мог забыць пра відавочныя бонусы, якія атрымаў дзякуючы дыктатару? Адказ на гэта пытанне я паспрабаваў знайсці з дапамогай Мірабель. Мірабель — маладая пышная мулатка, якая працуе служанкай у нашым доме. Вясёлая, аднак слаба адукаваная і вельмі далёкая ад палітыкі дзяўчына. Відавочна, што яна з тых самых народных нізоў, якія калісьці дзякуючы дыктатару нешта атрымалі.

— Мірабель, што ты думаеш пра Трухільё? — пытаюся падчас сняданку. Дарэчы, на сняданак у нас кожны дзень піналья — кавалкі ананасу. Каб я так на радзіме еў.

— Казёл ён, — упэўнена кажа Мірабель.

Вось і будуй пасля гэтага для народу лядовыя палацы, прабачце, шпіталі ў кожным раёне.

МЕРКАВАННЕ

# ЦІМАШЭНКА ВЫЙГРАЛА, КАЛІ ПРАЙГРАЛА, А ЯНУКОВІЧ ПРАЙГРАЎ, КАЛІ ВЫЙГРАЎ

**Украіна вызначылася: Януковіч уступіў на пасаду прэзідэнта. Ён перамог з вынікам на мяжы «статыстычнай памылкі», вырваўшы ў Юліі Цімашэнка тры з паловай працэнта. Але перамога яшчэ не азначае выйгрыш. Пра гэта журналіст «НЧ» Сяргей Салаўёў размаўляе з кіеўскім палітычным аглядальнікам Паўлам Саладзьком.**



— Я нядаўна чуў афарызм, які дастаткова трапна адлюстроўвае рэаліі прэзідэнцкіх выбараў ва Украіне: «Цімашэнка выйграла, калі прайграла, а Януковіч прайграў, калі выйграў».

Безумоўна, Януковіч сваёй перамозе рады. Знаёмыя, якія мелі доступ да лідэра Партыі рэгіёнаў, казалі, што ў выбарчым штабе Януковіча ў першыя дні пасля асэнсавання канчатковых вынікаў выбараў быў эйфарычны настрой. Але баюся, што «пахмелле» ад гэтай эйфарыі будзе вельмі цяжкім. Справа ў тым, што бачанне тэрміновых рэформаў, якія зараз крытычна неабходныя, у каманды Януковіча адсутнічае абсалютна. Далей «перадзелу ўласнасці» дзяржаўных і канкурэнтных прадпрыемстваў думка не сягае.

Чакаецца, што Януковіч як мінімум здолее наладзіць нейкае чыноўніцкае кіраванне, якое пераўтварылася ў суцэльны хаос пры знаходжанні Цімашэнка на пасадзе прэм'ера. Але гэта зрабіць яму будзе таксама складана.

Януковіч пойдзе тым жа шляхам па граблях, па якім ішоў Ючшанка. Значная частка ягоных выбаршчыкаў непазбежна расчаруецца. Хаця, магчыма, гэта і ёсць «вялікая місія Януковіча» — ён пакажа Паўднёва-ўсходняй Украіне, што ягоны кандыдат нічым не лепшы за Ючшанку і Цімашэнка. Януковіч–2010 — гэта і наша непазбежнае пахмелле пасля эйфарыі–2004.

Варта зазначыць, што пакуль у Януковіча няма, па-першае, падтрымкі парламента. А парламент шмат што вырашае. Прынамсі, зацвярджае прэм'ер-міністра. Па-другое, няма аднназначнай падтрымкі грамадства. Па-трэцяе, няма ўцямнага сцэнару выхаду з эканамічнага крызісу. Не наламаць дроваў пры такім раскладзе практычна немагчыма.

***— Што будзе зараз рабіць Юлія Цімашэнка?***

— У тэлезвароце да народа Юлія Цімашэнка агучыла свой варыянт: альбо ў парламенце захоўваецца кааліцыя «Наша Украіна — Народная Самаабарона — блок спікера Літвіна — блок Юлі Цімашэнка» (менавіта гэта кааліцыя два з нечым гады таму ў 226 галасоў — з мінімальнай большасцю — зрабіла Цімашэнка прэм'ерам і зараз лічыцца кіруючай), альбо яна сыходзіць у радыкальную апазіцыю.

Саюз з Партыяй рэгіёнаў Януковіча яна катэгарычна адмаўляе, і больш за тое, працягвае сцвярджаць пра беспрэцэдэнтныя фальсіфікацыі. Праўда, яшчэ паўгады таму яна гэтак жа ўпэўнена і радыкальна сцвярджала пра стварэнне «шырокай кааліцыі» з Партыяй рэгіёнаў.

Што тычыцца фальсіфікацый, то гэта яна дарэмна. Розніца ў выніках складае 800 тысяч галасоў. Калі сфальсіфікаваць столькі галасоў, абавязкова і непазбежна засталіся б дакладна акрэсленыя сляды, якія зафіксавалі б калі не назіральнікі ад Цімашэнка, то міжнародныя — дакладна.

Мой калега Андрэй Бандарэнка зрабіў матэматычны аналіз яўкі выбарцаў, згодна з якім можна з вялікай доляй верагоднасці вызначыць колькасць «падазроных» галасоў. Па ягоным разліку, колькасць «падазроных» галасоў — не больш за 280 тысяч, што складае менш за 2 працэнты ад яўкі выбаршчыкаў. І пры гэтым неабавязкова, што ўсе «падазроныя» галасы сфальсіфікаваныя.

Так што факт застаецца фактам, які б крыўдны для кагосьці ён ні быў: Януковіч — наш новы дэмакратычна абраны прэзідэнт.

Але вернемся да Цімашэнка. У апазіцыі Юлія Уладзіміраўна адчувае сябе камфортна і зручна. Калі кааліцыя «НУНС — блок Літвіна — БЮТ» разваліцца, а парламент зацвердзіць новага, прыхільнага Януковічу прэм'ера, то Юля сыдзе. І з новай энергіяй, якой ёй не займаць, будзе змагацца з «прамаскоўскімі алігархамі і данецкім крыміналам».

Развал жа кааліцыі «НУНС — блок Літвіна — БЮТ» зараз верагодны, як ніколі. Бо калісьці падкантрольная Ючшанку фракцыя НУНС страціла свайго лідэра і ўжо даўно разбітая на некалькі груповак. Літвін, які ў абмен на прэм'ерства Цімашэнка атрымаў пасаду спікера Вярхоўнай рады Украіны, ужо шчыра намякае Януковічу наконт сваёй гатоўнасці супрацоўнічаць, і нават бізнесоўцы з самога БЮТ не супраць перакінуцца да новай улады.

Такім чынам, хутчэй за ўсё, Украіну чакае двухпартыйная сістэма. Асабліва тады, калі ніхто з прэтэндэнтаў на прэзідэнцкую пасаду не набраў больш за палову галасоў. У гэтым вялікая заслуга тых 5%, хто ў другім туры выбараў не паленаваўся схадзіць на выбарчыя ўчасткі, але прагаласаваў «супраць усіх».

***— Такім чынам, перамога Януковіча больш-менш выгадная Юлі Цімашэнка? Зараз Януковіч зломіць ногі, выводзячы краіну з крызісу, а апазіцыянерка Цімашэнка набярэ балы на ягонай крытыцы і стане наступным прэзідэнтам Украіны?***

— Ну, наўрад ці перамога Януковіча выгадная Юлі Цімашэнка. Папросту таму, што Юлія Уладзіміраўна — ці амаль не адзіны ўкраінскі палітык, які цэніць уладу ў чыстым выглядзе, а не той прыбытак, які гэтая ўлада дае.

Але, калі спатрэбіцца, Цімашэнка можа і сысці ў жорсткую апазіцыю, хай ад гэтага і адгаворваюць яе нястойкія байцы. Зараз менавіта Цімашэнка — надзея для тых, хто асцерагаецца, не любіць альбо проста баіцца Януковіча. Яна іх сцяг. А на наступных выбарах — ці то парламенцкіх, ці то прэзідэнцкіх, яна ж пакуль самы пераканаўчы пераможца.

Галоўнае, каб і наступныя выбары адбыліся празрыста і дэмакратычна.

***— Крыху нечаканым у першым туры выбараў быў вынік лідэра партыі «Моцная Украіна» Сяргея Цігіпкі — 13,05% галасоў. Чацвёртае месца заняў Арсеній Яцэнюк з 6,96% галасоў. Каму яны могуць дапамагчы — Януковічу ці Цімашэнка?***

— І Яцэнюк, і Цігіпка зараз з'яўляюцца патэнцыйнымі кандыдатамі ў прэм'ер-міністры. Аднак найбольш верагодным кандыдатам лічыцца сябра каманды Януковіча Мікалай Азараў. Усё залежыць ад парламента, сітуацыя ў якім напэўная.

Януковіч кліча Цігіпку ў прэм'еры, але наколькі шчырая гэта пазіцыя — пытанне.

Відавочна адно: Цігіпку зараз самы час нарошчваць палітычныя мускулы ў выглядзе ўласнай сілы з шырокай сеткаю прыхільнікаў. Для таго, каб правесці добрую кампанію ці то на датэрміновых выбарах у Вярхоўную раду, ці то на выбарах у мясцовыя саветы. Мяркуецца, што апошнія будуць прызначаны на восень гэтага года. Так што Цігіпка і Яцэнюк не зробяць надвор'я ані Цімашэнка, ані Януковічу.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### АЛЯКСЕЙ КЛЯШКО



Віцэ-спікер заканадаўчага органа Краснаярскага краю дабіўся таго, каб дэпутаты заблакавалі ініцыятыву перайменавання архіпелага Паўночная Зямля ў Зямлю Імператара Мікалая ІІ. Спрэчкі вакол назвы архіпелага цягнуліся даўно. Упершыню гэта тэма паўстала ў сярэдзіне 2000-х гадоў, калі Санкт-Пецярбургскае гістарычна-геаграфічнае таварыства патрабавала «аднавіць гістарычную справядлівасць» і вярнуць архіпелагу першапачатковую назву — Зямля Імператара Мікалая ІІ. Так назвала адкрытыя астравы экспедыцыя 1913 года. Бальшавікі, натуральна, з гэтым змірыцца не маглі. У 1926 годзе архіпелаг стаў называцца Паўночнай Зямлёй. Аўтарау праекту вяртання гістарычнай назвы натхніла рашэнне Архірэйскага сабора Рускай праваслаўнай царквы пра прылічэнне Мікалая ІІ да ліку святых. Па законе, рашэнне пра перайменаванне геаграфічных аб'ектаў прымаюць рэгіянальныя парламенты. У выніку краснаярскія заканадаўцы выказаліся за захаванне цяперашняй назвы паўночных тэрыторый. Па словах дэпутата, сучасная назва архіпелага Паўночная Зямля шырока ўжываецца ў розных сферах і выкарыстоўваецца ва ўсіх картаграфічных выданнях. Таксама, на думку Кляшко, вельмі важным аргументам з'яўляецца той факт, што менавіта ў савецкі час было адкрыта, што архіпелаг уяўляе сабой сукупнасць выспаў. Амаль усе яны маюць такія назвы, як імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, Бальшавік, Камсамолец, Піянер і г.д.

### АЛЬВАРА УРЫБЕ



Канстытуцыйны суд Калумбіі забараніў Урыбе ў трэці раз балатавацца на пасаду прэзідэнта. Адмовілі Альвара і ў правядзенні рэферэндуму аб зменах у асноўны закон. Такім чынам, Урыбе сыходзіць, адкрываючы, на думку аналітыкаў, новую старонку ў гісторыі Лацінскай Амерыкі. Вядома, што Калумбія ў часы Урыбе была востравам лібералізму ў акіяне левых рэжымаў, якія ўсталяваліся ў суседніх краінах за апошняе дзесяцігоддзе. Стаўка Багаты на Вашынгтон прывяла да канфлікту з Уга Чавесам. Каракас і Багата актыўна змагаліся адзін з адным рукамі ўнутранай апазіцыі, набывалі зброю на радасць краін-пастаўшчыкоў. У выпадку перамогі 30 мая (дзень выбараў прэзідэнта) кандыдата ад левых, сітуацыя можа цалкам змяніцца. Праўда, для гэтага апазіцыі трэба аб'яднацца. Між тым, не паспеў суд абвесціць пра забарону Урыбе балатавацца, як знайшлося мінімум тры палітыка, якія хацелі б стаць галоўным кандыдатам ад левай апазіцыі. Зрэшты, у правым лагеры назіраецца падобны працэс.

### ФАРУК ЧЭЛІК



Дзяржаўны міністр Турцыі прыдумаў, як дасадзіць Германіі, якая ўпарта не жадае допуску Турцыі ў Еўрапейскі саюз. У адказ туркі вырашылі заснаваць Міністэрства па справах замежных туркаў. Займацца яно будзе ў асноўным нямецкімі туркамі, якіх у ФРГ больш за 4 мільёны. Сам чыноўнік кажа, што стварэнне міністэрства выклікана выключна праблемамі ўзмацнення эфектыўнасці адміністрацыі ўраду. Раней за пытанні турэцкіх грамадзян за мяжой адказвала аж чатыры камітэты ў розных міністэрствах. Цяпер іх аб'ядноўць у адну структуру. Галоўнай задачай новага міністэрства стане абарона правоў 5 мільёнаў туркаў у Еўропе. Берлін не ў захапленні ад ідэяў турэцкага ўраду. Відавочна, што справа ідзе пра штучную падтрымку калектыўнай ідэнтыфікацыі турэцкай камуны. Гэта яшчэ больш затармозіць інтэграцыю туркаў у нямецкую супольнасць. Тым больш, як заявіў міністр, фокус-групай для ацэнкі працы новай установы стануць дзеці турэцкіх эмігрантаў.

▸ КЛАСІК-АВАНГАРД

# Уладзімір Байдаў: «У ГІСТОРЫІ

**10 сакавіка ў Малой зале мінскай Філармоніі ансамбль салістаў «Класік-авангард» пад кіраўніцтвам Уладзіміра Байдава дае вялікі канцэрт «Ліцвінская мелодыя Ф. Шапэна», прысвечаны 200-годдзю вялікага польскага кампазітара (дату яго нараджэння пазначаюць 22 лютага ці 1 сакавіка 1810 года) і творчасці яго беларускіх паслядоўнікаў. Уладзімір Байдаў, унікальны спецыяліст па рэстаўрацыі старадаўняй музыкі, кіруе ансамблем салістаў-віртуозаў 25 гадоў, з часу яго заснавання ў 1985-м. «Класік-авангард» стаяў ля вытокаў адзінага ў Беларусі штогадовага Міжнароднага музычнага фестывалю імя Івана Салярцінскага (1989).**

**Колькасць твораў старадаўняй беларускай класічнай музыкі, адноўленай ансамблем у супрацоўніцтве з творчым калектывам «Беларуская капэла» Віктара Скарабагатава і выкананай у рамках знакамітых фестываляў «Адраджэнне беларускай капэлы», папросту непараўнальная — гэта цэлы адноўлены кантынент нацыянальнай культуры. «Мелодыі Радзівілаўскіх паркаў» з музыкай Голанда, Мацея Радзівіла, Міхала Клеафаса Агінскага, агучаная творчасць Напалеона Орды, адноўленыя кампазіцыі Станіслава Манюшкі, архівы музычнай капэлы з Забелаў на Віцебшчыне, адкрытыя ў віленскіх сховішчах, якія далі старт праекту «Адраджэнне беларускай сімфоніі» — дасягненні апошніх год. Уладзімір Байдаў шчыра падзяліўся з карэспандэнтам «Новага Часу» Аляксеем Хадыкам сваімі назіраннямі наконт стану развіцця даследаванняў і ўспрымання беларускай класічнай музыкі сёння і запрасіў на чарговы канцэрт.**





## Гісторыя і сучаснасць

Ансамблю ўжо 25 гадоў, і, як зразумела з яго назвы «Класік-авангард», мы выконваем і класічную музыку, і сучасную, аднак адводзім каля 70 працэнтаў свайго вялікага рэпертуару беларускай музыцы. Ацаніць аб'ём выкананага намі на сёння ўжо даволі складана, назаву прыблізныя лічбы: каля сотні сучасных твораў і каля 2 тысяч старых беларускіх.

Калі мы яшчэ пачыналі сваю творчую дзейнасць, выступалі пераважна ў зале касцёла святога Роха, трапіць на канцэрты «Класік-авангард» было цяжка, такі нацыянальны ўздым вызначаў настроі грамадства на мяжы 1980–1990-х гадоў. Мыігралі ў асноўным беларускія прэм'еры, і колькасць людзей, якія жадалі пачуць музыку, што не гучала 200–400 гадоў, была вялікая.

Дзякуючы з'яўленню ансамбля салістаў, сучасныя кампазітары пачалі пісаць ансамблевую музыку, што падштурхнула развіццё гэтага жанру ў краіне. Адпаведна, лад мыслення і творчасці сучасных кампазітараў быў цікавы і моладзі, і інтэлігенцыі. І ніякіх праблем з канцэртамі ў нас не ўзнікала. Зараз інтэнсіўнасць нашых канцэртаў павялічылася — з'явілася больш гістарычнага матэрыялу, які даследчыкі прывозяць з архіваў Польшчы, Літвы, Расіі. Палепшылася і якасць выканання, у музыкаў «набілася рука» на гістарычную музыку, з'явілася адчуванне яе характару і сэнсу.

Але, як не дзіўна, цікавасць да такой музыкі ўпала. У мінулым годзе да 190-годдзя Станіслава Манюшкі мы рыхтавалі прэм'еру адной з яго камерных опер «Латэрэя», адноўленай намі. Смешная, лёгкая, яркая музыка маладога «беларускага Моцарта», выбітнага таленту. І вось у малой залі Філармоніі, якая змяшчае толькі 180 слухачоў, аўдыторыя з цяжкасцю запоўнілася на прэм'ерны спектакль! Ёсць і рэклама, і афішы, і банеры, радыё і тэлебачанне дапамагаюць нам у прапагандзе беларускіх праграм. Мінск — культурны цэнтр краіны, і толькі 180 чалавек на прэм'еры?!

А мы багата што падрыхтавалі пад тую падзею: з Францыі прыехала праправпраўнучка Манюшкі, вядомы музычны дзеяч, у бібліятэцы Акадэміі навук да дня нараджэння Манюшкі Польскі Інстытут дапамог арганізаваць выставу кніг і дакументаў, святкаванні адбываліся ў радавой сядзібе кампазітара ў Убелі…

Для мяне загадка: юбілей нашага самага бліскучага, выдатнага і вядомага музыкі не выклікае дастатковай цікаўнасці? Мы не выконвалі чарговы раз раманс ці класічна звыклыя, хоць і абсалютна выдатныя, «Песні з-над Нёмна», мы двойчы ігралі цалкам эксклюзіўныя праграмы, і двойчы мелі праблемы з гледачамі. Кампакт-дыск «Новае неба Станіслава Манюшкі» мы выпусцілі дзякуючы падтрымцы Польскага інстытута.

Атрымліваецца, што ў культурнай прасторы краіны юбілей славутага земляка святкавалі толькі «Класік-авангард» і блізкія да яго людзі. Чаму нельга было зрабіць шырэйшую праграму, запрасіць замежных гасцей? Правесці фестываль яго імя на Радзіме? Падключыць польскае «Таварыства Манюшкі» — багатую і ўплывовую арганізацыю, якая больш за сто гадоў аб'ядноўвае аматараў кампазітара, у якую ўклаў усе свае сродкі яшчэ адзін выхадзец з Беларусі, дырыжор і музыка Мечыслаў Карловіч?

## Нацыянальная спадчына: падтрымка ці абыякавасць?

Не прэтэндуючы на вялікія залы кшталту Палацу Рэспублікі, запоўніць якія сапраўды складана, мы сутыкаемся з цяжкасцямі нават у малой зале Філармоніі. Гэта праблема апошніх 2–3 гадоў, мне здаецца, звязаная не столькі з намі, колькі, на жаль, з агульнай культурнай сітуацыяй у Беларусі…

Ці трэба спецыяльная рэклама? Магчыма. Але дзе нашая творчая інтэлігенцыя? Як пісьменнікі могуць не цікавіцца творчасцю Манюшкі, які супрацоўнічаў з бліскучым драматургам Дуніным-Марцінкевічам — у гісторыі культуры ўсё звязана! Патрыярх беларускай драматургіі напісаў лібрэта для 22-гадовага юнака, ужо тады заўважыўшы яго выдатны яркі талент, пачынаючы з «Рэкруцкага набору», пастаўленага ў Мінску ў 1841 годзе!

Тую ж «Латэрэю» варта б было паказаць і ў месцах яе прэм'еры ў Гародні (1841), дзе без нашага ўдзелу ўвасобіць пастаноўку складана, і ў Вільні, — думаю, мы абавязкова сабралі б там вялікую філарманічную залу, — але дзеля гэтага патрэбна арганізацыя. Дарэчы, у Вільні вялікая і добрая амбасада нашай краіны, чаму б не паспрабаваць дапамагчы прадставіць Манюшку ў Літве?

Здавалася, у нас добра захоўваецца памяць Міхала Клеафаса Агінскага, але ў той жа Літве — мы прысутнічалі на гэтых падзеях — адрэстаўраваны літаральна ўсе сядзібы, звязаныя з Агінскімі, і ў невялічкіх мястэчках адзін за адным адбываюцца 3–5-дзённыя музычныя фестывалі. Грамадскасць жыве гэтым, спаборнічаюць арганізатары, чакаюць выканаўцаў, свядома выбіраюць іх па стылі інтэрпрэтацыі музыкі. Істотна, які госць прыедзе. Яны ведаюць, хто выконвае Агінскага традыцыйна, а хто па-сучаснаму, хто інтэрпрэтуе яго — адбываецца свята, дзе спалучаецца нацыянальная традыцыя і культура сённяшняга дня!

І такіх прыкладаў — мноства, а сведчаць яны пра тое, што павінна быць актыўная дзяржаўная падтрымка ўласнай культуры і ўвага да яе. Як ні шкада, з беларускай тэлевізіі зніклі сур'ёзныя перадачы, прысвечаныя музычнай спадчыне, на экране амаль не з'яўляюцца такія спецыялісты, як Віктар Скарабагатаў, Вольга Дадзіёмава! Дзе колішні цыкл «Плошча мастацтваў»?

Яшчэ адзін прыклад: фагатыст Аляксей Фралоў і музыказнаўца Святлена Немагай, працуючы ў архівах Літвы і Польшчы, адкрылі цэлы корпус невядомых музычных твораў, аднавілі біяграфіі невядомых і малавядомых кампазітараў, што працавалі ў Беларусі ў XVIII–XIX стагоддзях. Выявіліся рукапісы рэлігійных твораў Дамініка Стэфановіча, настаўніка Станіслава Манюшкі, які раней лічыўся проста музыкам. Ці Юзэфа Дашчынскага, які жыў і працаваў у Рэчыцкім павеце. Выяўлены творы выключнай якасці.

У Польшчы ці Літве адкрыццё імёнаў нацыянальных кампазітараў адразу было б падтрымана ўшанаваннем іх памяці — выконвалася б музыка, усталёўваліся б мемарыяльныя знакі. А Святлена Немагай вымушана была выдаваць сваю працу пра Міхала Клеафаса Агінскага, самую падрабязную, прафесійную, прачулую манаграфію пра старую беларускую музыку, за якую яна атрымала апошнім часам шэраг міжнародных прызоў, сваім коштам! Ці гэта правільна? Дагэтуль Святлена не мае падтрымкі дзяржавы, каб надрукаваць «Лісты пра музыку», арыгінальныя тэксты Агінскага!

## Быць разам, адчуваць прыгажосць роднай культуры

Калі раней на нашы прэм'еры прыходзіў увесь культурны бамонд сталіцы, то сёння мы разлучаныя. Не дапамагаюць ні рэклама, ні анонсы ў «ЛіМе» ці «Культуры». Як не дапамагаюць і запрашэнні пры выпадковых сустрэчах на вуліцы. Я ўпэўнены, што на прэзентацыі кніг ці мастацкія вернісажы сёння прыходзіць меней прадстаўнікоў іншых творчых прафесій. Атмасфера 1990-х гадоў істотна адрознівалася: мы часта ігралі беларускую і іншую класічную музыку на адкрыцці мастацкіх выстаў. Дзе гэта зараз?

Я бачу некалькі прычын. У газетах у аддзелах культуры цяпер працуюць людзі, якія здольныя толькі пераказаць анонс канцэрта, але не могуць ці не хочуць данесці людзям сэнс музычнай падзеі. І публіка не ідзе на канцэрты «Класік-Авангарда» не таму, што збяднела: квіткі ў Філармонію каштуюць 6, 10, 14 тысяч, а вялікія залы палацаў на канцэрты папулярнай музыкі запаўняюцца і пры коштах у 20 разоў большых. Знікае цікавасць, знікае сістэмная праца па адукацыі людзей.

Што можна казаць, калі ў Акадэміі музыкі зачынена лабараторыя беларускай музыкі, якая раней прафесійна працавала і рыхтавала ноты і тых музычны матэрыял, з якім мы працуем? Ці можна прыбраць з музычнай адукацыі музычную літаратуру і прапанаваць выканаўцам, не маючы ўяўлення пра эпоху рамантызму, выконваць музыку Шапэна?

Як можна казаць пра музычную культуру і яе развіццё, калі ў нас элементарна не хапае канцэртных залаў? Мінск большы па колькасці жыхароў за Брусель, але ў апошнім — каля 70 пляцовак для класічнай музыкі, і ўсе яны актыўна працуюць. У нас ёсць толькі два залы — у Філармоніі! І канцэртаў класікі адбываецца, у лепшым выпадку, 15 на месяц. У адной з самых бедных краін Еўропы, Румыніі, праходзіць мацнейшы штогадовы музычны фестываль. З усяго свету з'язджаюцца аркестры — некалькі амерыканскіх суперкалектываў, выканаўцы з Еўропы, Азіі.

Уявіце, колькі каштуе толькі пераезд, рассяленне, візавае суправаджэнне гэтых соцень людзей! Але гэтыя выдаткі падымаюць прэстыж краіны, што добра разумеюць румыны. Пра фестываль піша прэса, спецыялісты з усяго свету аналізуюць развіццё розных жанраў музыкі, бо кожны фестываль шматбаковы, звяртаецца і да класікі, і да аўтэнтыкі, і да рэканструкцыі, да тэатральнай музыкі, оперы, сучасных тэндэнцый.

## Ці «Чужое багацце»?

У нас, на жаль, топавыя падзеі выклікаюць зусім не параўнальны рэзананс. 7 ліпеня 2009 года ў Нацыянальным тэатры оперы і балета адбылася прэм'ера адноўленай камічнай оперы Яна Давіда Голанда «Чужое багацце нікому не служыць», якая калісьці была напісана ў Нясвіжы і ішла на радзівілаўскай

# КУЛЬТУРЫ ЎСЁ ЗВЯЗАНА!»

сцэне з 1785 года. Прафесар Вольга Дадзіёмава знайшла старонкі оперы ў кракаўскім архіве, кіраўнік калектыву «Беларуская капэла» Віктар Скарабагатаў натхніў шэраг энтузіястаў на аднаўленне твору: мы працавалі над партытурай, Васіль Сёмуха пераклаў на беларускую мову з польскай і нямецкай захаваныя фрагменты партый, лібрэта з вытанчаным густам аднавіў Сяргей Кавалёў.

Чароўная прыгожая музыка, адна з першых нацыянальных опер, выдатныя выканаўцы. Пайшлі дыскусіі, круглыя сталы, публікацыі ў прэсе. Пастаноўка заўважана і дзяржавай — нядаўна калектыў Опернага тэатра атрымаў спецыяльную прэзідэнцкую прэмію — і аматарамі. Першыя прагоны — аншлагавыя. І вы ведаеце, замест іх рэгулярнага паўтору тэатр прапануе ў сваёй афішы гэты спектакль не часцей разу на паўтара месяцы!

Свежая, жывая падзея ў нацыянальнай культуры папросту не выкарыстоўваецца! Наш таленавіты малады спявак Юрый Гарадзецкі, які ўдзельнічаў адначасова ў мінскай пастаноўцы і вялікім еўрапейскім праекце па аднаўленні знойдзенай оперы маладога Гайдна, параўноўваў гэтыя вельмі падобныя па сэнсе падзеі.

У нас — знойдзены твор Голанда, там — Гайдна. У нас — кулуарная прэм'ера. Там — каардынаваны з Брусэля праект з удзелам шасці краін, конкурсы па сцэнаграфіі, рэжысуры, выкананні касцюмаў, адбор выканаўцаў — інтэлектуальны і фінансавы ўдзел некалькіх краін, неабходны для якаснага аднаўлення гістарычнай оперы, бо опера — сінтэтычны жанр, у якім важная кожная дэталь. Запланаваны прэм'еры ў еўрапейскіх культурных сталіцах, пачынаючы з Барселоны!

У нас жа прэм'ера Голанда не адбывалася як значная падзея, ні рэпертуарная, ні рэпетыцыйная палітыка тэатра не была ёй падпарадкавана! Паверце, хаця я належу да Філармоніі і аддаўшы партытуру ў Оперны назіраў за падзеямі з боку, магу сказаць, што калектыў тэатра перажыў прэм'еру «на валідоле». А з другога боку, не было адчування вялікай нацыянальнай прэм'еры, што немагчыма ўявіць у той жа Польшчы, калі ставяцца творы пачынальнікаў іх опернага мастацтва — К. Курпіньскага ці Ю. Эльснера. У атмасферы зала, выразе вачэй актораў трупы (не ўсіх, безумоўна) я не знаходзіў той высокай узнёсласці, якая адрознівае знакавую падзею ад ардынарнай пастаноўкі.

А ў «Чужым багацці…» ж ёсць прывязка да беларускай гісторыі, Нясвіжа, радзівілаўскага тэатра. Нарэшце, п'еса чарговы раз абвяргае тэзу пра тое, што беларуская класічная музыка нарадзілася толькі пасля 1917 года. Добра, што дырэктар оперы Валерый Гедройц, вельмі адукаваны і захоплены чалавек, ставіўся да работы над Голандам з вялікай цікаўнасцю, але такіх людзей, на жаль, адзінкі.

### Шапэн і Беларусь

Таму мне б асабліва хацелася, каб наша новая праграма «Ліцвінская мелодыя Ф. Шапэна», якая прагучыць 10 сакавіка ў Філармоніі, знайшла водгук у сэрцах і душах беларусаў — адпаведны таму, наколькі творчасць геніяльнага польскага кампазітара была звязана з багатай культурнай традыцыяй рэгіёну.

Піяніст і скрыпач чэх Войцэх Жыўны, першы настаўнік Шапэна па раялю, перад тым выкладаў у Беларусі, у Сапегаў у Дзярэчыне. Ужо калі Жыўны працаваў у Варшаве, бацькі маленькага чатырохгадовага Станіслава Манюшкі, выправіўшыся ў падарожжа, каб сын з маленства пабачыў свет, паказалі будучага кампазітара зноўтакі Жыўнаму. Усё ўзаемазвязана, блізка!

Чаму «Ліцвінская мелодыя»? Таму што ў Шапэна ёсць раманс на аднайменны верш С. Вітвіцкага і два раманы паводле Адама Міцкевіча. А ў сваю чаргу, без уплыву творчасці Шапэна не абышоўся ўвогуле ніхто з сучаснікаў і паслядоўнікаў. Шапэн геніяльны ў кожнай сваёй мініяцюры, кожнай маленькай «музычнай драме». Яго зорка ззяла настолькі ярка, ён настолькі дакладна і тонка раскрыў пачуцці і грані сваёй эпохі, часу рамантызму, што ніхто не пазбыўся абаяння яго музыкі — у розных формах.

У праграму мы ўключылі творы майстроў, асветленых геніем Шапэна і звязаных з беларускай зямлёй. Паланэзы таго самага Ю. Дашчынскага, вальсы Напалеона Орды, які пасля паразы паўстання 1831 года ў эміграцыі вучыўся фартэпіяннаму майстэрству ў Шапэна ў Парыжы. Да шапэнаўскай праграмы дапасоўваецца і імя Мечыслава Карловіча, заснавальніка сучаснага польскага сімфанізму, таму што ён нарадзіўся ў Вішневе ў Беларусі, і таму што ён напісаў першую і вельмі яркую кнігу пра Шапэна, і таму што, хоць і амаль праз 70 год, наследаваў традыцыі вялікага генія. Спадзяюся, гэты культурны кантэкст прывабіць нашых слухачоў…




ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# КАНЦЭРТ ДЛЯ ГІТАРЫ З ГІПСАМ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Гэта прэзентацыя выклікала немалое хваляванне ў шэрагах сталічных меламанаў па некалькіх прычынах. Але галоўная — у мінскім клубе «Рэактар» павінен быў прэзентаваць свой новы альбом «Porna» вядомы магілёўскі рок-музыка, паэт і лідэр аднайменнага гурта Янка Маўзэр.**

Да таго ж, праграма прэзентацыі абяцала і іншыя музычныя неспадзяванкі. Па-першае, разам з гуртом «Maŭzer» (цяпер назва гурта пішацца ў такім варыянце) арганізатары абяцалі выступ гурта «Akute», зноў жа з Магілёва, які стварылі былыя ўдзельнікі вядомай слухачам каманды «Глюкі». Рэгіянальны рокрух Берасцейшчыны павінен быў рэпрэзентаваць на гэтай імпрэзе nu-metal гурт «Сьцяна».

Цікава, што воляй лёсу падзеі гэтай прэзентацыі пачаліся задоўга да афіцыйнага старту мерапрыемства: у інтэрнэт прасачылася інфармацыя, што Янка Маўзэр зламаў нагу і выступіць у клубе «Рэактар» з акустычнай версіяй праграмы дыска «Porna». Таму перад прыхільнікамі паўставала цяжкая альтэрнатыва: альбо пайсці на акустычны канцэрт і не пачуць, як гучыць «Porna» «жыўцом», альбо дачакацца «другога прышэсця» гурта «Maŭzer» з электрычнай праграмай. Да гонару маладых мінчан, большасць з іх, разважыўшы пра фінансавыя выдаткі, вырашылі, што варта пабываць на абодвух канцэртах.

І вось на сцэне першы ўдзельнік рок-імпрэзы — рок-трыо «Akute», у складзе якога былыя ўдзельнікі «Глюкаў». Гэта вакаліст і гітарыст Стась Мытнік (з такім прозвішчам можна «прабівацца» спонсарства Дзяржаўнага мытнага камітэта), а таксама басіст Раман Жыгараў. За бубнамі ў складзе «Akute» грае Павел Емельянаў з гурта «NEVMA».

З першым акордам песні «Адзіноцтва» стала відавочна, што музыканты «Akute» маюць вялікі канцэртны досвед і адточанае выканаўчае майстэрства. Іх гучанне — па-сучаснаму шчыльнае, без аніякіх «правалаў», а іх вакальныя прыёмы ўзбагачаюць песні гурта эмацыянальна і меладычна. Усе кампазіцыі «Akute», сярод якіх адзначу найбольш яркія — «Маленства», «Я веру, мы дакранемся да зор», «Цішыня», «Агонь», — былі прынятыя слухачамі вельмі прыхільна. А значыць, цяпер надыходзіць чарга запісу іх альбома, каб надаць таленавітаму і перспектыўнаму гурту большую вядомасць.

Пад агульныя воплескі на сцэну падняліся наступныя прадстаўнікі магілёўскай плыні айчыннай рок-музыкі: Янка Маўзэр і гітарыст, вядомы па складу гурта «Maŭzer» пад нікам Kolhz. Як толькі прагучалі першыя ноты «Калыханкі» з альбома «Радасьць», слухачы пачалі здзіўляцца тое, для чаго яны сюды прыйшлі: спяваць разам з рок-зоркай.

Янка радаваў слухачоў сваімі вельмі арыгінальнымі вершамі. Гэткімі постмадэрнісцкімі споведзямі на эратычныя тэмы. Потым прапрацягваў свой сэт акустычнымі кампазіцыямі з новага альбома «Porna», а таксама песнямі з наступнай кружэлкі. І хоць падчас выступу магілёўскіх музыкантаў не было звычайнага слэму, большасць слухачоў засталася задаволенай выступам «Maŭzer» у unplugged-вырыянце і яшчэ больш умацавалася ў сваім жаданні зноў наведаць прэзентацыю «Porna».

У прыватнай гутарцы Янка распавёў, што музыкі «Maŭzer» даўно марылі зрабіць такі эксперымент, але з-за працы над альбомам на гэта не хапала часу. Цяпер дапамог няшчасны выпадак, каб у музыкаў з'явіўся такі вельмі важны канцэртны вопыт. Праўда, былі і тыя, хто пасля вершаў і песень у выкананні Янкі і Kolhz вырашыў, што ім у «Рэактары» рабіць больш няма чаго. Але яны памыліліся і джэк-пот выйгралі тыя, хто застаўся паслухаць прэзентацыю новага альбома гурта «Сьцяна» «Кропка вяртання».

«Сьцяна» засталася вернай свайму музычнаму крэда: жорсткі гітарны драйв і акустычны «кач» у спалучэнні з экстрэмальнымі сола саксафона. Гэта кружэлка чакала свайго выхаду доўга і з'яўлялецца другой пасля іх дэбютнага альбому «Рыфмы лёсу» (2002). Мо таму музыкі «Сьцяны» вырашылі выкласціся на сцэне на «ўсе сто» і скарыць публіку сваімі рыфамі, якія бяруць пачатак, упэўнены, ад Пяруна.

Галоўная дзеючая асоба шоу «Сьцяны», «энерджайзер» усёй каманды — гітарыст Павел Прахараў. Хмары тэатральнага дыму, якія час ад часу засцілалі сцэну «Рэактара», Павел разганяў за секунды. Можа, дзеля гэтага ўдзельнікі «Сьцяны» выступалі на сцэне босымі. Але за гэтай штучнай смугой нельга было не заўважыць неверагодную экспрэсіўнасць песень, выдатнае выканаўчае майстэрства і працаздольнасць музыкантаў, якія прэзентавалі слухачам свой новы дыск...

Што тычыцца музычнага напаўнення сэта «Сьцяны», то сталічныя слухачы ўжо знаёмыя з новымі творамі берасцейцаў. Рытмы і мелодыі такіх кампазіцый, як «Кропка», «Кім я быў», «Мяне не існуе», а асабліва цяжкі хіт «2000000», выклікалі сапраўдны фурор сярод тых, хто прысутнічаў на прэзентацыі. А з ім і здаровую цікавасць да новых альбомаў рэгіянальных лідэраў айчыннага року. А гэта значыць, што слухачы маюць усе падставы чакаць навінак і ад мінскіх каманд. Чым жа адкажа сталічны рок-бамонд прэтэнзіям правінцыйных гуртоў на лідэрства ў беларускім рок-руху?


Гурт «Сцяна»

Фота аўтара


Гурт «Akute»


Гурт «Maúzer»




# «ДАЙ ДАРОГУ!» У БРЭСЦЕ

Любоў ПРАНЕВІЧ

**26 лютага ў Брэсце панк-рокавы гурт «Дай Дарогу!» сабраў поўную залу прыхільнікаў. Пасля доўгага перапынку ў выступах каманды каля чатырох соцень яе фанаў прыйшлі ў клуб «Zio Pepe».**

Музыкі адыгралі дзве гадзіны і стварылі берасцейцам сапраўднае свята. «Дай Дарогу!» ездзіць з канцэртамі па Беларусі і краінах СНД, выступае на фестывалях па страйк-болу, байк-злётах, у тым ліку і на папулярным «Гоблін-шоу» на Украіне.

З іншым праектам, клубнай электроннай музыкай «4KUBA», удзельнікам якога з'яўляецца Юра, гурт ездзіць па Еўропе. Дарэчы, у кастрычніку 2009 года «4KUBA» адыгралі ў Мінску на адной пляцоўцы з «The Prodigy».

Але ў родным Брэсце нешта, як кажуць, не склалася. Два гады гурту не давалі афіцыйнага дазволу выступаць. Гарвыканкамам быў раптоўна адменены і дабрачынны канцэрт, запланаваны на 1 снежня 2009 года, сродкі ад якога павінны былі быць пералічаны ў дапамогу дзецям-інвалідам.

Ад адмены канцэрту страцілі толькі дзеці: «Мы хацелі, — расказвае лідэр гурта Юра Стыльскі, — выступіць з акустычным канцэртам, падрыхтавалі лёгкую праграму з гітарамі, бубнамі і флейтай. Гэта не скрадзеныя недзе грошы, а заробленыя творчасцю. Людзі прыходзяць на канцэрт і такім чынам самі выказваюць жаданне аддаць гэтыя грошы на дабрачыннасць. А мы пры гэтым з'яўляемся так званым «пераходнікам». І прыйшло б многа народу».

Лідэр гурта лічыць, што гарвыканкам у свой час згубіў з імі кантакт: «Калі ў нас ёсць рупар, калі мы можам данесці нешта да моладзі, дык чаму б не знайсці агульнай мовы?» Тое, што гурт унесены мясцовымі чыноўнікамі ў нейкі чорны спіс, ён тлумачыць іх даўнім выступам у Брэсце, калі на канцэрце гучалі нефарматныя песні. Але, як распавядае Юра, тады яны павінны былі так зрабіць. Пасля гэтага ў адносінах да іх на пустым месцы працягвалася стварэнне стэрэатыпу сацыяльна-небяспечных людзей.

Стыль тэкстаў «Дай Дарогу!» Юра акрэслівае як бытавы: «Мы выбралі спяваць пра жыццё». Па рэакцыі фанатаў, узрост якіх ад 14 да 30, відавочна, што гэты выбар знаходзіць водгук — прысутныя ведаюць і спяваюць усе песні разам з музыкамі.

Творчасць гурта даступная для слухачоў, іх музыка выкладзена на сайце ў інтэрнэце для бясплатнага карыстання. Некаторыя трэкі можна паслухаць у двух варыянтах: акустычным і больш цяжкім, а таксама паглядзець. На многія песні намаганнямі дырэктара гурта Уладзіміра Йодава знятыя відэакліпы, тры з якіх — «Дзень-ноч», «Тома» і «Самародак» — паказваюць па расійскаму музычнаму тэлеканалу «А1», відэакліп «Тома» з'явіўся на «MTV Беларусь» і нядаўна трапіў на ўкраінскі «Enter TV».

Пры гэтых поспехах гурта зоркавай хваробы ва ўдзельнікаў «Дай Дарогу!» ані граму. Сакрэт можа быць і ў тым, што калі б ім і хацелася раўняцца на некага, дык гэта на лідэра «Nirvana»: «Спяваць, як Курт Кабэйн, мець такі ж імідж, быць сваім пацаном у дошку і так усіх «парваць», — гаворыць Юра. — Але я не ведаю, колькі гадоў павінна прайсці, каб з'явіўся калі-небудзь нехта, падобны да Курта».



▸ ФЕЛЬЕТОН

# ДЭСТРУКТЫЎНЫЯ ЛІТАРАТАРЫ

Лёлік УШКІН



**Цікавае жыццё пачынаецца ў сяброў Саюза беларускіх пісьменнікаў, якія на дзяржаўным узроўні называюць як тыя секты — «дэструктыўная арганізацыя».**

### З дзённіка Зміцера Ф.

«20.02.10. Сёння канчаткова вырашыў — трэба кідаць піць. Сасніў, што Барыс Маісееў — мой аватар. Абавязкова трэба кадзіравацца».

Толькі Зміцер Ф. — вядомы ў вузкіх колах мінскай багемы паэт-дэканструктывіст, сябра СБП, паспеў дапісаць гэту фразу, як пастукалі ў дзверы. На парозе стаяў «перац» з казлінай бародкай і ў гарнітуры-тройцы. У руцэ незнаёмы трымаў кій.

— Добры дзень калега, — сказаў візіцёр, уважліва разглядваючы няголены памяты твар гаспадара пакоя.

Зміцер працягнуў руку:

— Добры дзень. Вы таксама літаратар? Нешта я вас не бачыў на нашых слэмах.

Госць, паціскаючы руку, усміхнуўся:

— Мы калегі ў іншай галіне. Скажам так, нас аб'ядноўвае тое, што мы належым да гэтак званых «дэструктыўных арганізацый». Я генеральны гуру Храма сатаністаў імя новага прыходу антыхрыста.

Зміцер трохі ашызеў:

— Ну гэта ж поўная лажа. Ха-ха. Якая з нашага Саюза пісьменнікаў дэструктыўная секта?

Адказ Зміцера не здзівіў барадача, які тым часам прайшоў у цэнтр заваленага пляшкамі і паперамі пакоя і акупаваў адно з крэслаў.

— Разумею, разумею: усе мы давалі клятву — не выдаваць таямніцы нашага аб'яднання. Аднак супакойцеся. Пакінем асобныя пункты статуту вашай ложы. Да справы. Як вы глядзіце на тое, каб аб'яднаць рэсурсы нашых груповак. На днях мы збіраемся замураваць у адной з пячэраў пад Пензай — так загадвае нам Сатана. Перасядзім надыходзячы апакаліпсіс. Ну а потым прыйдуць нашы. Пагадзіцеся, сябрам дзвюх сектаў будзе весялей у пячэры.

Пісьменнік зразумеў, што перад ім сапраўдны вар'ят.

— Слухайце, гэта вельмі цікава, аднак я не магу ў пячэру, у мяне хутка вершаваны слэм у Кіеве з Сяргеем Жаданом.

У наступную секунду пісьменнік зразумеў, што перад ім не проста вар'ят, а яшчэ і фанатык: нечакана суразмоўца ўскочыў і даў Зміцеру ў лыч.

— Што?! Калі вы не прызнаеце слова Сатаны, вы зневажаеце самога Сатану!

Лежачы на падлозе, Зміцер заўважыў, як сатаніст заносіць кій над яго галавой.

— А той, хто зневажае майго гаспадара, павінен памерці! — вішчаў незнаёмы.

Нечакана для абодвух у дзверы зноў пастукалі. На парозе пакою з'явіўся нейкі чалавек. Сатаніст не чакаў такога развіцця падзей. Ён ускочыў, адпіхнуў госця і пабег уніз па лесвіцы.

— Добры дзень. Што тут у вас адбываецца? — спытаў новы госць, лысаваты мужчына ў паліто.

Зміцер падняўся.

— Вы хто?

Было відавочна, што госцю трохі няёмка.

— Вы ведаеце, я ваш калега.

Зміцер, які толькі што меў справу з іншым калегам, на ўсялякі выпадак наблізіўся да кухні. У выпадку чаго ён збіраўся пусціць у ход нож або які іншы прадмет кухоннага начыння.

Госць між тым працягваў:

— Я таксама пісьменнік, аднак з іншага саюза, афіцыйнага. Давайце шчыра. Я таксама хацеў бы атрымаць такі талент, як у сяброў вашага аб'яднання. «Адкуль такія рэсурсы?» — задаваў я часта сябе пытанне. Цяпер, пасля таго, як вас прызналі сектай, разумею. Каму вы моліцеся на вашых месах? Напэўна, Янку Купале, заснавальніку СБП? Што вы там прыносіце яму ў ахвяру? Я гатовы прайсці рытуал і прадаць душу Янку, каб атрымаць яго талент. Я хачу стаць таленавітым!

Чалавек упаў перад Зміцерам на калені.

Наш герой зразумеў, што перад ім яшчэ адзін вар'ят. Аднак памятаючы, чым закончылася размова з папярэднім псіхам, вырашыў паводзіць сябе інакш.

— Ну добра. Значыцца, каб прадаць душу Купале і атрымаць яго талент, трэба пайсці на магілкі з томікам твораў Чурунца. Роўна а поўначы разарвіце кніжку на дробныя кавалачкі. Пасля голасна скажыце: «Крэкс-пэкс-фэкс! О, вялікі пісьменнік, дай мяне свой талант». І зранку будзеце майстрам слова. Менавіта па такой схеме наш ордэн праводзіць свае літаратурныя оргіі. Толькі пра гэта нікому.

— Дзякуй.

Візіцёр пачаў спяшацца, каб падрыхтавацца да рытуалу.

— І не забудзьце сказаць: «Крэкс-пэкс-фэкс», — нагадаў Зміцер, выстаўляючы госця на лесвіцу.

### З дзённіка Зміцера Ф.

«23.02.10. Сёння канчаткова вырашыў, што трэба кідаць піць. Прысніўся страшны сон пра таго хлопца з СПБ, якога я адправіў на могілкі. Быццам «крэкс-пэкс-фэкс» — гэта сапраўднае заклінанне, з дапамогай якога можна атрымаць літаратурны талент. Аднак не Янкі Купалы, а Генры Мілера. Абавязкова трэба кадзіравацца».

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА: 220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214. Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 199
Падпісана да друку 05.03.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.